№№155–156
(2883–2884)

16 кастрычніка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

АДУСЮЛЬ

ЕС накіруе місію ў Беларусь

У бліжэйшыя тыдні місія Еўрасаюза накіруецца ў Мінск, каб ацаніць, як ЕС можа развіваць палітычныя і эканамічныя адносіны з Беларуссю.

Пра гэта заявіў Вярхоўны прадстаўнік Еўрасаюза па знешняй палітыцы і бяспецы Хаўер Салана на сумеснай прэс-канферэнцыі з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым. У сваю чаргу кіраўнік беларускага МЗС адзначыў, што наша краіна гатовая развіваць прадуктыўныя адносіны з ЕС, паведамляе агенцтва ПРАЙМ-ТАСС.

Ну і метады!

Па справе аб выбуху ў КДБ пачалі выклікаць пераможцаў школьных алімпіяд па хіміі, паведамляе сайт Хартыя'97.

Старшакласнікаў і тых, хто летась скончыў школу, у масавым парадку апытваюць, бяруць у іх адбіткі пальцаў і аналіз сліны.

Выбухнула праз 67 гадоў

Адзін чалавек загінуў, другі — моцна паранены. Яны спрабавалі разабраць міну часоў Другой сусветнай вайны.

"У двары дома 38-гадовага жыхара вёскі Хомічы Быхаўскага раёна адбыўся выбух, у выніку якога загінуў гаспадар дома і цяжка паранены 22-гадовы жыхар вёскі Дунаёк, які дастаўлены ў шпіталь", — паведаміла прэс-служба УУС Магілёўскага аблвыканкама.

У двары знайшлі яшчэ тры міны.

Апошняе паляванне

З 5 кастрычніка родныя нічога не ведалі пра лёс 20-гадовага маладога чалавека, якога шукалі як зніклага без вестак: праваахоўнікам спатрэбілася няшмат часу, каб праліць святло на ўсе акалічнасці гэтага факту.

У прыватнасці, у ходзе расследавання было ўстаноўлена, што 5 кастрычніка каля апоўдні паблізу вёскі Прудок Калінкавіцкага раёна ў лесе падчас палявання няшчаснага застрэліў з зарэгістраванага ружжа ТОЗ 21-гадовы рабочы. І паспрабаваў замесці сляды гэтага здарэння: ён расчляніў цела ахвяры і закапаў. Злачынца арыштаваны.

Намеснік міністра супакоіў аўтаўладальнікаў

Экалагічны падатак для фізічных асоб — уладальнікаў транспартных сродкаў у Беларусі ўводзіць пакуль што не плануецца. Аб гэтым паведаміў першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр Апацкі.

Ён адзначыў, што асобны падатак ёсць на гаруча-змазачныя матэрыялы. "У адносінах да ўладальнікаў транспартных сродкаў цяпер пытанні прапрацоўваюцца, але мы ўлічваем і ўплыў сусветнага фінансавага крызісу, рэзкі рост цэн на энерганосьбіты за апошні час", — падкрэсліў першы намеснік міністра.

Віншуем!

У Шатландыі прайшоў чэмпіянат свету па спартыўнай акрабатыцы. Беларускія спартсмены прывезлі два медалі. Свой чэмпіёнскі статус пацвердзіла жаночая пара Аліна Юшко і Кацярына Мурашка. Дзяўчаты другі раз запар сталі чэмпіёнкамі свету.

Бронзавую ўзнагароду ў жаночай групе заваявала тройка Марыя Гіруць, Галіна Старэвіч, Таццяна Мотуз.

ЗАКУЛІССЕ

Інтрыга застаецца

Цэнтрвыбаркам Беларусі зацвердзіў дату адкрыцця першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання. Сесія пачне работу 31 кастрычніка.

Цяпер у складзе верхняй палаты парламента новага склікання 55 сенатараў. Яшчэ 8 чалавек павінны быць прызначаны Аляксандрам Лукашэнкам. *"Думаю, што да таго часу, як Савет Рэспублікі збярэцца на першую сесію, частка квоты прэзідэнта будзе выкарыстана, і ў верхняй палаце парламента з'явяцца новыя персаналіі. Нехта з 8 чалавек, магчыма, будзе прызначаны прэзідэнтам пазней. У заканадаўстве гэтыя тэрміны не агавораны",* — сказала журналістам старшыня Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына.

Нагадаем, што многія чыноўнікі чакаюць слова прэзідэнта з асаблівым нецярпеннем. Бо пакуль што без пасады застаюцца такія вядомыя і актыўныя людзі, як Мікалай Чаргінец, Анатоль Малафееў, Аляксандр Абрамовіч і гэтак далей. Акрамя таго, менавіта ў Савеце Рэспублікі маюць шанц набыць рабочыя кабінеты былыя блізкія паплечнікі Аляксандра Лукашэнкі — Віктар Шэйман і Уладзімір Канаплёў. Карацей кажучы, спіс жадаючых стаць сенатарамі такі вялікі, што выбіраць Лукашэнку ёсць з каго. Але ўжо зразумела, што і пакрыўджаныя таксама будуць.

Алег СНОЎ.

Ураджай пералічыць Дзяржкантроль

Аляксандр Лукашэнка даручыў Адміністрацыі прэзідэнта і Камітэту дзяржаўнага кантролю "неадкладна вывучыць стан спраў з уборкай ураджаю". Пра гэта паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Як гаворыцца ў паведамленні, якое прэс-служба прэзідэнта распаўсюдзіла 14 кастрычніка, такое даручэнне дадзена "ў сувязі з завяршэннем сельскагаспадарчай уборачнай кампаніі, апошні этап якой праходзіць у няпростых умовах надвор'я".

Прэзідэнт, у прыватнасці, запатрабаваў "старанна прааналізаваць адпаведнасць наяўных статыстычных звестак рэальнай сітуацыі на месцах".

"Да вінаватых за правалы ў працы, скажэнне статыстычнай справаздачнасці будуць прыняты самыя жорсткія меры, — гаворыцца ў паведамленні прэс-службы. — На працягу тыдня прэзідэнту павінна быць паведамлена аб становішчы ў рэгіёнах".

ПАЛІТКУХНЯ

Еўрапейскі аванс

Часова спынены візавыя санкцыі ў дачыненні да беларускіх чыноўнікаў

Панядзелак 13 кастрычніка можа сапраўды стаць паваротным у гісторыі беларуска-еўрапейскіх стасункаў. Еўропа дала беларускаму кіраўніку шанц. Нягледзячы на тое, што беларускія парламенцкія выбары не прызнаны ні свабоднымі, ні дэмакратычнымі, прынята рашэнне аб часовай, на паўгода, адмене візавых санкцый, якія былі ўведзены ЕС у дачыненні да высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў — тых, хто асабліва адзначыўся на ніве "правоў чалавека".

У спісе неўязных у ЕС засталіся толькі пяць чалавек — **Лідзія Ярмошына, Уладзімір Навумаў, Юрый Сівакоў, Дзмітрый Паўлічэнка** і **Віктар Шэйман.** Такім чынам, санкцыі ў дачыненні да Аляксандра Лукашэнкі на паўгода зняты. У Еўропе не ўтойваюць, што гэта палітычны аванс...

Закуліссе

Гэта было сапраўды няпростае рашэнне. Літаральна напярэдадні сустрэчы міністраў замежных спраў краін ЕС у Люксембургу, на якую быў запрошаны і беларускі міністр Сяргей Мартынаў, ананімны французскі дыпламат паведаміў агенцтву "Рэйтэр", што тры краіны — Швецыя, Галандыя і Партугалія — выступаюць катэгарычна супраць адмены візавых санкцый для Аляксандра Лукашэнкі. Паколькі рашэнне аб адмене санкцый міністры павінны былі прыняць адзінагалосна, то да апошняга не было зразумела, ці выканае Еўрасаюз патрабаванне беларускага боку аб скасаванні санкцый.

Краіны, якія асабліва настойліва дабіваліся "авансу" афіцыйнаму Мінску — Літва, Польшча, Германія, прыводзілі наступныя аргументы: жорсткая палітыка выніку не мела; ізаляваная з Захаду, Беларусь апынаецца ва ўсё большай залежнасці ад Расіі; у рэшце рэшт Еўропа павінна зрабіць крок насустрач Мінску ў адказ на вызваленне палітзняволеных, каб мець хаця б нейкія гарантыі, што ў Еўропе не з'явяцца новыя вязні сумлення. Праціўнікі "мяккага падыходу" сцвярджалі, што верыць дыктатару нельга, заахвочваць трэба канкрэтныя крокі, а не абяцанні. А крокаў пакуль няма, што даказалі апошнія парламенцкія выбары...

Такім чынам, палітычныя шалі вагаліся. І кансультацыі ішлі літаральна да апошніх хвілін. Так, міністр замежных спраў Чэхіі Карэл Шварцэнберг прама ў пражскім аэрапорце перад адлётам на пасяджэнне ў Люксембург сустракаўся з Аляксандрам Мілінкевічам. Пазіцыя Мілінкевіча (як і ўвогуле Аб'яднаных дэмакратычных сіл) наступная: Еўропе трэба паспрабаваць наладзіць дыялог з афіцыйным Мінскам, але на пэўных умовах.

Што ж, спроба зроблена. Зараз мяч у гэтай гульні на беларускім баку.

Афіцыйна

Кіраўнікі МЗС краін Еўрасаюза спадзяюцца "на паступовае пашырэнне адносін з Беларуссю", а таксама гатовы "развіваць дыялог з беларускімі ўладамі і ўсімі, хто бярэ ўдзел у дэмакратычнай дыскусіі". Пра гэта гаворыцца ў заяве, прынятай па выніках пасяджэння міністраў замежных спраў краін ЕС у Люксембургу. Мэта ЕС — "падтрымка прагрэсу ў галіне дэмакратызацыі і выканання правоў чалавека ў Беларусі", зазначаецца ў дакуменце.

Міністры паведамляюць аб прынятым рашэнні прыпыніць на паўгода візавыя санкцыі ў дачыненні да высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў. У спісе неўязных у краіны ЕС замест 41 прозвішча засталося пяць: кіраўнік Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына, міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, былы дзяржсакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман, былы кіраўнік МУС Юрый Сівакоў і былы камандзір брыгады спецыяльнага прызначэння ўнутраных войскаў МУС Дзмітрый Паўлічэнка, якія падазраюцца ў тым, што маюць дачыненне да палітычных знікненняў у 1999—2000 гадах.

На працягу шасці месяцаў Еўрасаюз пакідае за сабой права перагледзець санкцыі, уведзеныя ў дачыненні да беларускіх улад, у залежнасці ад прагрэсу ў галіне рэфармавання выбарчага заканадаўства і дэмакратызацыі.

Пры гэтым міністры заявілі аб магчымасці "аднавіць санкцыі раней, у залежнасці ад дзеянняў беларускіх улад у галіне дэмакратыі і правоў чалавека".

Чаго чакае Еўропа?

На думку міністраў краін ЕС, Беларусі неабходна "прывесці заканадаўства ў адпаведнасць з абавязацельствамі АБСЕ і міжнароднымі стандартамі ў галіне дэмакратычных выбараў, а таксама зрабіць канкрэтныя крокі для паважання дэмакратычных каштоўнасцяў, вяршэнства закона, правоў і свабод чалавека, у прыватнасці, свабоды выказвання, свабоды СМІ, свабоды сходу і палітычнай асацыяцыі".

Дзеючыя асобы

У Мінску рашэнне ЕС успрынята неадназначна.

Так, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына лічыць гэтае рашэнне "несправядлівым і няправільным": "Паўгода — гэта надта малы тэрмін, каб можна было гаварыць аб рэальным пацяпленні. Гэта ў пэўным плане крыху зневажальнае паслабленне". Што тычыцца асабіста яе, то Лідзія Ярмошына паведаміла, што будзе працягваць працаваць гэтак жа, як працавала дагэтуль. "Я думаю, няўдзячнасць — гэта адзін з біблейскіх заганаў", — заўважыла Л.Ярмошына. Паводле яе слоў, рашэнне ЕС — "дэманстрацыя той самай няўдзячнасці".

Лідэры Аб'яднаных дэмакратычных сіл падтрымліваюць "формулу часовага і частковага зняцця санкцый".

Як паведаміў старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, "мы падтрымліваем формулу часовага і частковага зняцця санкцый у жорсткай прывязцы да канкрэтных дзеянняў беларускіх улад па паляпшэнні палітычнага клімату ў краіне пры выкананні хаця б чатырох умоў. У гэтыя чатыры ўмовы ўваходзяць змяненне выбарчага заканадаўства, стварэнне роўных умоў для дзейнасці ўсіх СМІ і доступу апанентаў улады да дзяржаўных СМІ, стварэнне нармальных умоў для дзейнасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў і адмена артыкулаў Крымінальнага кодэкса, што прадугледжваюць пераслед за палітычнае іншадумства.

Анатоль Лябедзька таксама зазначыў, што Еўропа ўзяла пад увагу патрабаванні АДС адмяняць санкцыі часткова і часова. "Адзінае разыходжанне — гэта ў дачыненні да Аляксандра Лукашэнкі. На мой погляд, Еўропа прыняла дачаснае рашэнне. Аляксандр Рыгоравіч прадаў тое, што не мае каштоўнасці, — толькі сваю рыторыку, не пацверджаную ніякімі справамі і фактамі", — лічыць А.Лябедзька.

Затое рашэнне ЕС крытыкуе былы намеснік міністра замежных спраў Андрэй Саннікаў. "Дзеянні Еўрасаюза маюць дакладнае азначэнне і дакладныя аналогіі ў гісторыі. Гэта называецца супакаенне дыктатара. Так Еўропа паводзіла сябе ў 30-я гады ў адносінах да Гітлера, а ў наступным у адносінах да іншых дыктатараў у Афрыцы, Лацінскай Амерыцы і Сярэдняй Азіі", — заявіў Саннікаў. Па меркаванні палітыка, рашэнне ЕС аб зняцці візавых абмежаванняў з Аляксандра Лукашэнкі і ягоных чыноўнікаў хутчэй за ўсё будзе мець зусім не тыя наступствы, на якія разлічваюць некаторыя еўрапейцы.

"Рэжым Лукашэнкі не ўспрыме гэта як сігнал добрай волі, а расцэніць, як слабасць Еўропы і як прызнанне таго, што ў краіне творыцца беззаконне і беспакаранасць людзей ад улады", — упэўнены Саннікаў.

Што ж, пажывём — пабачым. У любым выпадку, у рэжыме ізаляцыі ад Еўропы мы ўжо жылі, паглядзім, што будзе адбывацца падчас палітычнай адлігі.

"Беларусь знаходзіцца перад гістарычным выбарам: пайсці ў бок дэмакратыі і незалежнасці, альбо змірыцца са стагнацыяй", — заявіла камісар ЕС па знешняй палітыцы Беніта Ферэра Вальднер. Шкада толькі, што выбар будзе рабіць не Беларусь, а асабіста Аляксандр Лукашэнка.

Алег СНОЎ.

Засталіся неўязнымі

Лідзія Ярмошына.

Уладзімір Навумаў.

Дзмітрый Паўлічэнка.

Віктар Шэйман.

Юрый Сівакоў.

ТЫМ ЧАСАМ

З'явілася інфармацыя аб тым, што ў сувязі з адменай візавых санкцый Аляксандр Лукашэнка можа ўзначаліць беларускую дэлегацыю на інвестыцыйным форуме ў Лондане. Раней кіраўніком дэлегацыі называлі прэм'ера Сяргея Сідорскага.

Нідэрландку хвалюе сітуацыя ў Беларусі

Нідэрландскі дэпутат Еўрапарламента Жанін Хеніс-Пласхерт накіравала французскаму старшынству Савета Еўрасаюза запыт аб канкрэтным плане дзеянняў Беларусі і ЕС па паляпшэнні сітуацыі ў краіне.

У інтэрв'ю БелаПАН еўрадэпутат паведаміла, што ўдакладняе ў Савета ЕС, паводле якіх крытэрыяў будуць правярацца праз паўгода неабходныя крокі беларускіх улад, ці існуе план дзеянняў, ці будуць ажыццяўляцца кансультацыі. "13 кастрычніка кіраўнікі МЗС краін ЕС часткова прыпынілі дзеянне візавых санкцый адносна беларускіх чыноўнікаў, у тым ліку прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, але чаму так мала вядома аб тым, што Брусель чакае ў адказ?" — гаворыць Ж.Хеніс-Пласхерт.

Сярод іншых пытанняў, якія еўрадэпутат адрасуе французскаму старшынству Савета ЕС: ці плануецца сустрэча кіраўніцтва Еўрасаюза з апазіцыйнымі лідэрамі, у прыватнасці, з экс-кандыдатамі ў прэзідэнты Аляксандрам Казуліным і Аляксандрам Мілінкевічам; чаму вырашана зняць з А.Лукашэнкі візавыя санкцыі пасля адмовы ў выдачы беларускай візы віцэ-старшыні Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Крысціне Оюланд.

"Я за дыялог з Мінскам, але на аснове апраўданых і канкрэтных крытэрыяў", — заявіла прадстаўнік Нідэрландаў. Адказ французскага старшынства павінен паступіць на працягу пяці тыдняў, указала еўрапарламентарый.

Ж.Хеніс-Пласхерт таксама зазначыла, што дэпутаты парламента Нідэрландаў маюць намер звярнуцца да кіраўніка МЗС краіны Максіма Верхагена па тлумачэнні яго пазіцыі адносна Беларусі, бо першапачаткова ён выказваўся супраць адмены візавых санкцый. Акрамя таго, нідэрландскія дэпутаты ўдакладняць, ці існуе план канкрэтных крокаў, якія чакаюцца ад афіцыйнага Мінска ў адказ на частковае прыпыненне візавых санкцый.

Марына РАХЛЕЙ.

ОТКРЫТЫМ ТЕКСТОМ

Я не верю Ермошиной

В последние недели госпожа Ермошина не сходила с экрана телевизора. Но как бы она ни пыталась убедить людей в том, что парламентские выборы прошли в строгом соответствии с белорусскими законами, я ей не верю.

Спросите, почему я не верю? А хотя бы потому, что за все дни, прошедшие после выборов, я не услышал по тому же БТ ни одного мнения со стороны тех, кто, как говорит Ермошина, проиграл. Если все делалось по закону, то почему по-прежнему не подпускают к телевидению, радио, в госгазеты тех, кто забросал жалобами окружные комиссии, ЦИК, суды, прокуратуры?

Видать, и Ермошина, и все те, кто стоит за ней (или над ней), боятся обнародования конкретных фактов фальсификации выборов. Но, как гласит народная мудрость, шила в мешке не утаишь. И, конечно же, не один я не верю Ермошиной.

Казимир КАЧУРО,
избиратель.

Сергей ЛЕБЕДЕВ: ничего не видели, ничего не слышали

По итогам парламентских выборов в Беларуси позицию миссии наблюдателей от СНГ выразил на встрече с А.Лукашенко Сергей Лебедев, исполнительный секретарь Содружества Независимых Государств: нарушений законодательства не заметили, претенденты на депутатские мандаты боролись в равных условиях.

Как говорится, слукавил, и глазом не моргнув. Что господину Лебедеву до того, что при формировании комиссий сплошь и рядом был попран Избирательный кодекс. Закон категорически запрещает вводить в избирательную комиссию более одного представителя от того или иного трудового коллектива. А что получилось? Очень многие комиссии почти полностью состояли из представителей одного предприятия. При этом комиссию, как правило, возглавлял кто-то из руководителей этого предприятия. Такая подчиненность не могла не наложить отпечаток на характер работы комиссий.

Не насторожило Сергея Лебедева и других наблюдателей от СНГ и то, как подсчитывались голоса. Может, кто-либо из наблюдателей попробовал пересчитать бюллетени? Нет, конечно же.

Сравнивали результаты досрочного голосования и в последний день, 28 сентября? Опять же нет.

А поинтересовались, почему студентов буквально в приказном порядке загоняли на досрочное голосование? Что вы, Сергею Лебедеву и его друзьям, видимо, и в голову это не пришло. Как и поинтересоваться тем, что любую урну можно было за три минуты демонтировать и заменить любое количество бюллетеней.

Господина Лебедева и остальных наблюдателей от СНГ не заинтересовало и то, почему очень многих внутренних наблюдателей вообще не допустили к контролю над подсчетом голосов.

Конечно, легче всего сказать: мы ничего не видели, ничего не слышали. Но в этом ли заключалась роль миссии наблюдателей от СНГ?

Вы, господин Лебедев, заслужили похвалу от Лукашенко и Ермошиной. Но не дождетесь этого от меня, рядового избирателя. Как, уверен, и от миллионов других белорусов, которые считают, что их в очередной раз обманули.

Иван КОРНЕЙЧИК,
избиратель.

Іх лёс хвалюе Беларусь!



Юрый Захаранка
знік 3375 дзён таму

Віктар Ганчар
знік 3246 дзён таму

Анатоль Красоўскі
знік 3246 дзён таму

Дзмітрый Завадскі
знік 2959 дзён таму

ОФИЦИАЛЬНО

Ограничения на оздоровление детей

Александр Лукашенко установил ограничения на оздоровление детей за рубежом.

Так, согласно подписанному указу, на оздоровление за рубеж смогут выезжать дети до 14 лет и не более трех раз в одно и то же иностранное государство.

"Исключение составляет выезд в иностранные государства, с которыми Беларусь заключила международные договоры до 1 октября 2008 года", — сообщает пресс-служба. На самом деле исключением стало одно государство — Италия.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

20 гадоў таму ў Мінску ўпершыню на мірных грамадзян была кінута вайсковая сіла. Гэта быў адказ камуністычных улад на аб'яднанне дэмакратычных сіл у Беларускі Народны Фронт.

("Народная воля" распачынае публікацыю серыі матэрыялаў пра восеньскія падзеі 1988 года.)

"Дзяды" 30 кастрычніка 1988 года. На мітынгу па дарозе ў Курапаты выступае Уладзімір Арлоў. Справа — Зянон Пазьняк, трэці злева — пісьменнік Алесь Асташонак.

Кальцо міліцыі і ўнутраных войскаў сціскаецца...

"Пройдемте..."



Удзельнікі "Дзядоў-88" ідуць ад Усходніх могілак на Курапаты.
Фота Уладзіміра КАРМІЛКІНА з архіва Уладзіміра АРЛОВА.

Магчыма, гэта першы бел-чырвона-белы сцяг, узняты ў найноўшай гісторыі Беларусі.

Аляксей Марачкін:

«Першы з'езд БНФ спрабавалі сарваць камуністы»

Пра заснаванне Беларускага Народнага Фронту распавядае вядомы мастак, кіраўнік творчай суполкі "Пагоня", сябра Аргкамітэта Беларускага Народнага Фронту Аляксей Марачкін.

— Спадар Аляксей, Фронт адзначае 20-годдзе. Што значыць 20 гадоў для палітычнай арганізацыі?

— Безумоўна, 20 гадоў — гэта невялікі юбілей, але гэта дата, якую трэба адзначыць нашаму дэмакратычнаму руху. Таму што якраз Беларускі Народны Фронт і распачаў змаганне за дэмакратыю, свабоду і незалежнасць. І, безумоўна, той 1988 год, дату 19 кастрычніка мы ніколі не забудзем. Гэтая дата назаўсёды ў мяне ў душы. Гэта гістарычная памяць. Кепска, а такое часта здараецца, што людзі забываць, што было 5, 10, 15 гадоў таму, і не могуць узгадаць, што адбывалася, хто што сказаў, хто што набяцаў.

— Вы як мастак як успрынялі ўтварэнне Беларускага Народнага Фронту?

— Я і мае калегі-мастакі вельмі чакалі гэтай падзеі, чакалі ўтварэння Фронту, а фактычна — развалу савецкай імперыі, камуністычнай партыі. І хоць было заяўлена, што мы гатовы супрацоўнічаць з лепшымі сіламі камуністычнай партыі, фактычна Фронт паўстаў на глебе антыкамунізму. Гэта ўсім вядома. І якраз нашы мастакі падтрымалі гэтую ідэю. Ужо да 1988 года ў нас была сфарміравана суполка мастакоў, якая падзяляла ідэі і каштоўнасці Фронту. Гэта група засведчыла свой накірунак у мастацкай дзейнасці — гэта наша культура, наша спадчына і нашы славутыя імёны. І вось ужо тады сфарміравалася ядро, якое пазней афармілася ў творчае аб'яднанне "Пагоня". Калі называць асобы, то гэта Уладзімір Крукоўскі, Віктар Маркавец, Мікола Купава, Аляксей Марачкін ды іншыя. Мы тады шмат чаго зрабілі і зараз працягваем гэтую справу.

— Як вы ставіцеся да таго, што ваша дзейнасць і дзейнасць суполкі "Пагоня" была і застаецца ў той ці іншай ступені палітычнай. Мы можам казаць пра мастацтва. Але калі мастацтва забараняецца, калі творы выстаўляюцца ў напаўпадпольных умовах — гэта ўжо палітыка...



— Калі творца мне скажа, што ён апалітычны, то я не паверу, бо нават калі ён апалітычны, то яго, відаць, выкарыстоўваюць іншыя палітыкі. Мяне шмат разоў папракалі менавіта ў палітычнасці, але я заўсёды пераконваў сваіх апанентаў, што мастак, як і любы іншы чалавек, можа і нават павінны мець сваё меркаванне і бачанне. Палітыкі ў тым ліку. Ёсць нямала мастакоў, якія сваёй творчасцю адгукаюцца на вострыя палітычныя праблемы. Гэта Алесь Пушкін, Алесь Цыркуноў, я таксама як мінімум адну карціну на вострую палітычную праблему стварыў. Жыццё і ўлада надаюць безліч сюжэтаў. І гэта нармальна. Мы ж памятаем, як Валянцін Сяроў пісаў расстрэл рабочых, Гоя, Пікаса таксама пісалі на палітычную тэматыку.

— Раскажыце пра ўтварэнне Беларускага Народнага Фронту. Што вам запомнілася?

— Я ўваходзіў у Аргкамітэт Фронту, памятаю першыя пасяджэнні, якія праходзілі ў Доме літаратара. Вядома, незапамятны дзень 19 кастрычніка ў Чырвоным касцёле, дзе мы прысутнічалі. Памятаю палымяныя выступы Зянона Пазьняка і Васіля Быкава. Калі камуністы спрабавалі сарваць з'езд, то лейцы ў свае рукі ўзяў Васіль Быкаў і не даў магчымасці камуністам гэта зрабіць.

— А якія былі спробы сарваць з'езд? Што адбылося?

— Былі правакацыйныя выступы сяброў камуністычнай партыі пра тое, што і назва кепская, і што Фронт будзе непапулярны ў народзе. Хапала метадаў у камуністаў. Але гэтага не адбылося. І было вельмі правільна, што ў Аргкамітэт увайшла вялікая колькасць аўтарытэтаў, сярод якіх і Янка Брыль, і заслужаныя народныя артысты. І ўсе чакалі перамен! І дачакаліся. Бо менавіта фракцыя БНФ у Вярхоўным савеце ўнесла бел-чырвона-белы сцяг у залу. Вельмі добра памятаю і першы з'езд БНФ у Вільні. Мы, мастакі, тады былі вельмі з'яднаныя ідэяй абнаўлення, незалежнасці, змагання. І рабілі выставу ў зале, дзе адбываўся з'езд.

— А што рабілі мастакі, калі адбывалася зацвярджэнне сімвалаў?

— Гэта было вельмі запамінальна. А для мастакоў — тым больш. Гэта былі Уладзімір Крукоўскі, Мікола Купава, Яўген Кулік, Віктар Маркавец. Мы рыхтавалі плакаты, стэнды з гісторыяй нашай сімволікі. І гэтая выстава была ў залах Вярхоўнага Савета ў Доме ўрада. Гэта таксама паўплывала на тое, што сімволіка была прынятая.

— А што вам запомнілася з таго часу, калі БНФ яшчэ не быў утвораны?

— Я быў знаёмы з Сяргеем Дубаўцом, Сержуком Сокалавым-Воюшам, Вінцуком Вячоркам, калі яшчэ не было БНФ, але была "Майстроўня". І я ніколі не забуду выступленне Вінцука ў Доме ўрада сярод бюракратаў пра дзейнасць "Майстроўні" і "Талакі", пра ідэі Беларускага Народнага Фронту, пра розныя набалелыя пытанні. Я быў уражаны тым, як здорава і аргументавана даказваў Вінцук Вячорка. Ніколі не забуду, як падчас сходу ў клубе Будтрэста-1 на вуліцы Маскоўскай моладзь лезла ў вокны, каб трапіць, каб нешта пачуць ці ўбачыць з таго, што адбывалася на сходзе. Тое самае адбывалася і ў Доме літаратара.

— Што можна сказаць пра сённяшні Фронт?

— Зараз іншыя ўмовы, крыху іншае жыццё. Але той, у каго аднойчы сэрца загарэлася, да канца свайго жыцця будзе несці гэтую паходню ў душы, будзе змагацца за каштоўнасці БНФ. Мне думаецца, што сёння БНФ стаіць у авангардзе нашага руху. Асобы, якія ёсць у БНФ, той інтэлектуальны патэнцыял, яны засталіся. Мала аб'явіць зараз афіцыёзу "Мы — беларусы", трэба быць пазнавальным не па гэтай шыльдзе, а па душы. БНФ першы заявіў, што мы хочам быць свабоднымі. А нашыя сакральныя сімвалы — наш сцяг і герб — вядуць да перамогі, да святла. І я веру, што прыйдзе час, калі ўсё стане на свае месцы.

Анатоль ПЯТРОЎ.

Юрась Хадыка — пра Васіля Быкава і пра БНФ

19 кастрычніка Беларускі Народны Фронт адзначыць дваццацігоддзе. Непарыўна з лёсам Фронту звязаны знакаміты беларускі пісьменнік, адзін з заснавальнікаў і першых сяброў БНФ Васіль Быкаў. Успамінае пра славутую постаць сябра Партыі БНФ, адзін з яе заснавальнікаў Юрась Хадыка.

Хадыка: — Дзякуючы Быкаву, я таксама запісаўся ў Фронт. Ягоны аўтарытэт быў для мяне надзвычай вялікі.

— Што, на ваш погляд, падштурхнула пісьменніка да палітычнай дзейнасці?

Хадыка: — У той час БНФ "Адраджэньне" — гэта была не зусім палітыка. Я б сказаў, што гэта было і больш, і менш, чым палітыка. Гэта было паўстанне супраць несвабоды, супраць маны. А Быкаў асабіста прайшоў праз вайну. Бачыў гвалт над чалавечай асобай, над чалавечай воляй. Ён скрозь усё жыццё пісаў на гэту тэму. Нічога дзіўнага, што ён апынуўся ў шэрагах людзей, для якіх Адраджэньне было мэтай жыцця.

— Што вас найбольш прываблівала ў пісьменніку?

Хадыка: — У ягоным вобліку мяне ўсё прываблівала. Пачынаючы ад знешняга выгляду. Ён нагадваў майго бацьку. Яны паходзілі з блізкіх мясцін. Быкаў — з Вушаччыны, а мой бацька — з Сенніцкага раёна. Толькі мой бацька быў больш каржакаваты, шыракаплечы. Але такі ж сівы, з блакітнымі вачыма, маўклівы...

— А Васіль Быкаў быў маўклівы?

Хадыка: — Так. З яго слова было даволі цяжка выцягнуць. Мы часта сустракаліся. Успаміны засталіся вельмі цёплыя. Калі ён ужо з'ехаў, жыў у Фінляндыі, я напісаў яму два доўгія лісты. Народны Фронт тады ўжо раскалоўся. Пазьняк павёў за сабою частку людзей у такую амаль прыватную арганізацыю. Быкаў мне адказаў. У мяне захоўваецца гэты ліст.

— Чакаеце магчымасці аддаць яго ў музей?

Хадыка: — Безумоўна. Можа, у Гародню?..

«Чорная» нядзеля



Ішла перабудова ("працэс пайшоў"). І ішлі мы. Ішлі людзі. Мужчыны і жанчыны. Сталыя і маладыя. Бацькі з дзецьмі: хто вёў за руку, хто нёс на плячах. (Так, так, бачыў на ўласныя вочы.) Ішлі ў напрамку Усходніх могілак, у напрамку стаўшых ужо ўсім вядомых Курапатаў. Праз газету і радыё іх папярэджвалі, што мітынг-рэквіем адменены, іх запалохвалі, ім перашкаджалі, змяніўшы графік працы метро, аўтобусаў і тралейбусаў. Але людзі ішлі. Балазе да таго ж — была нядзеля, быў даволі пагодны дзень. І гэта былі, — згадваю перажытае тады адчуванне, — незвычайны збор, незвычайнае шэсце. Гэта былі адначасова і хросны ход, і "дарога смерці — Курапаты", і шлях жыцця — перабудова, абнаўленне, і рашучы поступ тых, хто, як колішнія купалаўскія беларусы, зноў захацелі "людзьмі звацца". Насамрэч распачатая Гарбачовым перабудова мела ў дадзеным выпадку, апроч іншага, спецыфічную адметнасць, азначала яшчэ для беларуса абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, духоўнай тоеснасці, магчымасць вяртання да сваіх каранёў, сваіх абрадаў, звычаяў, святаў, у тым ліку і да Дзядоў. Пра што, дарэчы, гаварылі ў той дзень у полі пад Курапатамі Зянон Пазьняк і Уладзімір Арлоў. *"Каб перабудова не рухалася, бюракратыя хоча стварыць канфрантацыю ў нашым народзе,* — звяртаўся да загнаных на асенняе поле людзей З.Пазьняк. — *Мы за тое, каб паважаўся наш народ, каб паважалася наша гісторыя, нашы нацыянальныя сімвалы. Хопіць абуваць нас у лапці!"*

Так, людзі ішлі сказаць: "Хопіць! Да якога часу!" Але гэта было мірнае, з жалобным адценнем, шэсце. Ішлі на мітынг-рэквіем, ішлі, каб пакланіцца праху ахвяр сталінскіх рэпрэсій. І яшчэ ішлі, каб так вось, разам, усёй грамадой, сустрэць Асяніны, змітраўскія Дзяды. *"Хвала табе, Божа, Дзядоў дачакаліся. Завем вас, святыя, дзяды, даўно не страчаліся..."*

Сустрэчы з "дзядамі" на гэты раз, апоўдні, у нядзелю, 30 кастрычніка, не адбылося. Людзей, якія ішлі з самымі добрымі, самымі чалавечымі намерамі, людзей у цывільным сустрэлі людзі ў форме. Сустрэлі ваяўніча — з дубінкамі і слёзацечным газам, з вадамётамі і спецмашынамі — "варанкамі". Сустрэлі, каб забараніць, разагнаць, расправіцца. Улада спалохалася за сваю, уладную шкуру. А ў страха, як вядома, вочы вялікія...

Нехта, памятаю, крануў мяне за рукаў. Аглянуўся, бачу побач мастака Яўгена Куліка.

— Што гэта робіцца?! Што гэта яны робяць з намі, гады?! — ледзь не са слязамі пытаецца ён, паказваючы на "варанок", у які толькі што запіхнулі Аляксея Марачкіна, Міколу Купаву і іншых, незнаёмых мне людзей. І яшчэ пытаецца:

— Ці будзеце пісаць? Ці дасцё што-небудзь пра гэта ў сваёй газеце?

— Абавязкова дадзім. У наступным нумары, — адказваю яму. Рашэнне ўнутрана прымаецца само сабой.

Пра тое ж загаварыў і Васіль Быкаў, пазваніўшы назаўтра раніцай па тэлефоне. Карыстаючыся магчымасцю, я спытаўся, ці не напісаў ён сам для "ЛіМа". Ведаеш, сказаў ён, пазванілі з рэдакцыі "Огонька", ад імя самога рэдактара, і папрасілі тэрмінова зрабіць для іх артыкул. Заканчваю і буду перадаваць па тэлефоне. Так дамовіліся. Назваў: "Дубінкі замест перабудовы".

— Ну што ж, — крыху пашкадаваў я. — Але раз для "Агонька", то гэта, бадай, будзе яшчэ больш важна. Хай ведаюць у Маскве. А загаловак удалы, тое, што трэба.

(Заўважу, што вострапубліцыстычны, грунтоўна аргументаваны артыкул В.Быкава быў сапраўды аператыўна надрукаваны ў надзвычай папулярным на той час часопісе "Огонек".)

"Дубінкі замест перабудовы"... Дайшло і да Масквы (гэта — асобная тэма). Дайшоў розгалас да сусветнай грамадскасці. Акадэмік Сахараў, які ў той час знаходзіўся ў ЗША, выказаў у сувязі з падзеямі ў Мінску "вялікую заклапочанасць ходам перабудовы"...

Можна было б глянуць на тую антыперабудовачную, тую "чорную" нядзелю 1988 года ў рэтраспектыве, з пазіцый нашага сённяшняга дня, але гэта зноў-такі асобная тэма, тэма, для якой больш стасуецца іншы жанр — не ўспаміну, а даследавання.

Анатоль ВЯРЦІНСКІ,
тагачасны рэдактар тыднёвіка "Літаратура і мастацтва".
Кастрычнік 2008 г.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

Снизилось количество белорусских банков, предоставляющих кредиты на жилье

В связи с мировым финансовым кризисом количество белорусских банков, предоставляющих кредиты на жилье, существенно снизилось. Такой вывод аналитиков белорусского финансового интернет-ресурса infobank.by содержится в новом рейтинге кредитов на недвижимость.

Кроме того, эксперты отмечают, что ряд белорусских банков объявил о повышении с 15 октября процентных ставок по вновь выдаваемым кредитам. Еще несколько банков уже повысили эти ставки.

Аналитики также отмечают ухудшения в части срока рассмотрения кредитных заявок. Так, в основном банки существенно увеличили сроки рассмотрения ориентировочно до трехчетырех недель, "поэтому в целом кредиты обходятся их получателям дольше и дороже".

Анализируя условия жилищного кредитования, предоставляемого белорусскими банками, интернет-ресурс приходит к выводу, что "в общем случае кредиты в евро и долларах США кажутся наиболее выгодными". Напротив, кредиты в белорусских рублях располагаются на более низких строчках рейтинга.

"Однако с учетом абсолютно непредсказуемой ситуации с курсом валют в будущем нужно отдавать себе отчет, что возвращать валютные кредиты банку придется тоже в валюте. Поэтому экономия на процентной ставке по валютному кредиту вполне может обернуться большой курсовой разницей в будущем", — подчеркивают авторы исследования.

Забойства ці няшчасны выпадак?

Драгічынскі раён ускалыхнула новая трагедыя. Зноў загінулі двое пенсіянераў, 76-гадовыя муж і жонка, якія жылі на ўскрайку пасёлка Антопаль у прыватным доме.

Як паведаміў намеснік начальніка Драгічынскага раённага аддзела МНС Іван Казека, дом пенсіянераў загарэўся ўначы. Пажарныя былі вызваны суседзямі. Згарэў дах дома, пашкоджаны сцены і мэбля. Да прыезду супрацоўнікаў аддзела МНС гаспадары былі ўжо мёртвымі. Прычына пажару пакуль не высветлена. Электраправодка спраўная, з электрапрыбораў працаваў адзін халадзільнік, печ нанач не тапілі, гаспадар у хаце не курыў. Пенсіянеры вялі прыстойны лад жыцця.

Пракуратурай Драгічынскага раёна разглядаецца версія забойства з мэтай рабавання. Дачка памерлых гаварыла, што ў бацькоў была сабрана пэўная сума грошай, якія ляжалі ў шафе. Грошай у доме, па словах Казекі, не знойдзена ні рубля. На дыване, дзе ляжаў гаспадар, заўважаны цёмныя плямы. Мяркуецца, што гэта кроў. Дыван адпраўлены на экспертызу.

Нагадаем, што напрыканцы мінулага года і на пачатку 2008-га ў Драгічынскім раёне было забіта 9 пенсіянераў. Спачатку ўсе гэтыя выпадкі спісваліся на звычайную смерць, але калі закрываць вочы на забойствы стала немагчыма, міліцыя ўсё ж узбудзіла крымінальную справу. Лічыцца, што злачынцы злоўлены і сядзяць пад арыштам. І вось новае злачынства...

Ганна КАРАВАЙСКАЯ.

НЯВЫДУМАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Гадзіннік з сінім цыферблатам

Нанач пахаладала. Адам Куніцкі цяплей апрануўся і, замкнуўшы хату, падаўся на другі канец сваёй вёскі Важнікі да замужняй дачкі Алены. Заўтра раненька ён меўся ехаць у райцэнтр класціся ў бальніцу, бо ў апошні час надта моцна балела левая нага. На мінулым тыдні быў у паліклініцы, але хірург сказаў, што месцаў пакуль няма, і прызначыў прыехаць менавіта заўтра: маўляў, выпішу аднаго хворага і пакладу цябе. Адам хацеў сказаць дачцэ, каб час ад часу наглядала за хатай, бо ці мала якія людзі цяпер па вёсцы шастаюць. Накульгваючы, дабрыў да даччыной сядзібы і памкнуўся адчыніць брамку. Ледзь толькі дакрануўся да кручка, як той упаў на сцежку.

— Вось пустадомак, — прабубнеў сабе пад нос стары, маючы на ўвазе зяця Мікіту. — Вароты пахіліліся, зараз і брамка разваліцца, а яму ўсё за гарэлкай няма калі. Ды і ўнук Алёшка не лепшы. Ужо зараз год, як вярнуўся з арміі, а ўсё без справы бадзяецца.

Алена толькі што падаіла карову і працэджвала малако. Убачыўшы на парозе старога хворага бацьку, яна кінула свой занятак і, змахнуўшы з табурэткі нябачныя пылінкі, запрасіла сесці.

— А дзе ж твае гаспадары? — перавёўшы дух, запытаў Адам. — Няма каму на падворку ўпраўляцца. Хутка ўсе сабакі да вас будуць забягаць, як вароты паваляцца.

Акуратны і гаспадарлівы Адам не мог цярпець такой неахайнасці.

— Бо і няма каму, — згадзілася Алена. — Лёшка паехаў у Баранавічы на работу ўладкоўвацца, а Мікіта п'яны на ложку ў запечку спіць.

— І праўда, — з горыччу прамовіў стары. — Я заўтра ў бальніцу лягу, — цяжка ўздыхнуўшы, працягваў ён. — Колькі праваляюся там — невядома. Хачу, каб за хатай наглядала і каб ведала, дзе ў мяне грошы ляжаць. Сабраў на пахаванне. Банкам не давяраю, бо ўжо раз падчысцілі ўсе мае зберажэнні. Грошы ляжаць у сталe, што стаіць у чыстым пакоі. Верхнюю шуфлядку адчыніш і ў самым кутку яны, закручаныя ў старую газету. Знайсці вельмі лёгка.

— Што ты, тата, загаварыў пра такое, — усхліпнула Алена і выцерла набеглую слязу ражком фартуха. — Пажыві яшчэ. Мама вось памерла, і ты сабраўся. А я з кім застануся?

— Ад мяне гэта не залежыць, — коратка і сурова прамовіў Адам. — Гады немаладыя і хвароба нежартоўная. Так што заўтра паеду, а як назад — тое невядома.

Алена наліла ў міску гарачай, толькі што зваранай макароны, забяліла свежым малаком. Стары бацька, кінуўшы на цвічок ля дзвярэй цёплую шапку, сеў да стала. Пад'еўшы, заспяшаўся дадому.

— Цямнее, а на вуліцы ніводнага ліхтара. Цяжка ісці будзе, — патлумачыў ён свой адыход. Але справа была не ў гэтым. Проста Адам не мог знаходзіцца пад адным дахам са сваім зяцем-недарэкам, які з запечку распаўсюджваў на ўсю хату алкагольны перагар. Піць кожны дзень было для яго асноўным заняткам на працягу многіх гадоў. Некалі добры токар, якога хвалілі далёка за межамі калгаса, апусціўся, як, можа, ніхто ў іхняй вёсцы. Калі прагналі з работы, хадзіў па хатах. Каму дровы папілуе, каму плот паправіць. І ўсё за бутэльку. А на сваёй сядзібе нават пальцам не паварушыць. Усё трымалася на Аленіных руках. Ды з яе паштальёнскай зарплаты, уласна кажучы, і жыла сям'я.

Прыйшоўшы дадому, Адам сабраў усё неабходнае, што трэба ў бальніцу, а заўтра раненька накіраваўся на аўтобус. У райцэнтры на аўтастанцыі папрасіў нейкага хлопца, каб той па мабільніку выклікаў таксі.

— А я тут на сваёй машыне. Сядай, дзядуля, падкіну цябе задарма, а то за таксі будзеш плаціць чатыры тысячы.

Адам з радасцю адзначыў, што ёсць жа і сярод маладых добрыя і спагадлівыя людзі. "Мой унук не павёз бы задарма чужога чалавека, — цяжка ўздыхнуўшы, падумаў стары. — Не Аленін характар, бацькаў".

Як ні спяшаўся Адам у бальніцу, як ні спадзяваўся на лячэнне, але яго чакала расчараванне. Калі ён, дачакаўшыся сваёй чаргі, зайшоў у кабінет да хірурга, той, апусціўшы вочы, прамовіў:

— Прабачце, што ганяю вас туды-сюды, але сёння пакласці ў бальніцу не магу, бо не выпісаў таго чалавека. Прыйдзіце, калі ласка, паслязаўтра. А можа, ёсць дзе пажыць у гарадку?

— Нічога, я дадому паеду, — пакорліва згадзіўся Адам. Яго стрыечная сястра жыла ў гарадку, але стары хворы чалавек не хацеў на-дакучваць людзям. Ён не стаў дабірацца на аўтастанцыю, а выйшаў на дарогу, што вяла ў напрамку іхняй вёскі. Так было бліжэй. Спадзяваўся на спадарожную машыну. І дзеду пашанцавала: маладая прывабная дзяўчына, што сядзела за рулём чырвонай іншамаркі, спынілася адразу, як толькі ён махнуў рукой. Давезла да вёскі і нават грошай не ўзяла.

Пакуль Адам дайшоў з асфальта на сваю сядзібу, ужо зусім сцямнела. Балела ўсё цела, вельмі хацелася легчы. Нават есці не стаў, хоць і не еў цэлы дзень. Скінуўшы куртку і разуўшыся, ён у рубашцы і штанах лёг на ложак, закрыў вочы. У хаце было халаднавата і ціха. Толькі на сцяне, акурат над яго галавой, гучна цікаў стары масіўны гадзіннік з сінім цыферблатам. Даўно, калі яны з Кацярынай былі яшчэ маладыя, гэты гадзіннік купілі ў Мінску, як ездзілі на вяселле да пляменніцы. Вельмі ж ён падабаўся Кацярыне. Калі ішла замуж Алена, маці хацела падарыць ёй, але дачка адмовілася.

— Ён вам падабаецца, то няхай вам і будзе, — сказала яна на гэта.

Адам добра і не памятае, ці ён заснуў, ці толькі крышку задрамаў, як раптам пачуў, што па хаце нехта ходзіць. Чалавек той не асцерагаўся, бо, мабыць, быў упэўнены, што акрамя яго тут больш нікога няма. Адаму стала неяк вусцішна, хоць палахлівым ён не быў. Затаіўся на ложку, чакаючы, што ж тут будзе далей. Невядомы чалавек падышоў да стала і адчыніў верхнюю шуфлядку, упоцемку пачаў мацаць там рукой.

— Злодзей! Зараз скрадзе грошы. Забыўся я замкнуць дзверы... — маланкай пранеслася ў галаве старога. А той ужо шабуршаў газетай, у якую былі загорнуты сабраныя па кропельцы з жабрацкай пенсіі няшчасныя тысячы рублёў. Адам ціхенька падняўся, зняў са сцяны гадзіннік з сінім цыферблатам і, падкраўшыся да незнаёмца ззаду, з усёй сілы апусціў таму на галаву гэты важкі прадмет. Злодзей упаў, а стары біў і біў яго. Боль, адчай, крыўда напаўнялі ўсю істоту Адама. Ён супакоіўся тады, калі зусім знямогся. Кінуў на падлогу гадзіннік, на нягнуткіх нагах падышоў да ўключальніка, запаліў святло. Якім жа вялікім было яго здзіўленне, калі ўбачыў побач з паламаным гадзіннікам свайго недарэку і п'яніцу зяця. Чэрап быў прабіты ў некалькіх месцах і стары не сумняваўся, што зяць мёртвы, але ў душы не прамільгнула нават ценю шкадавання.

— Можа, так яно і лепш, не будзе свет паскудзіць. І Алене рукі развяжуцца, і мне ў турме шмат мучыцца не прыйдзецца, бо з такім здароўем і на волі доўга не працягнеш. Бач, пачуў, што я казаў Алене пра грошы...

Адам выключыў святло і, не замыкаючы хату, пайшоў да дачкі. Упоцемку спатыкнуўся на гадзіннік, здаровай нагой адпіхнуў яго ў кут. Цыферблат бразнуўся аб металічную ножку ложка, нібы паставіў кропку ў бесталковым жыцці Адамавага зяця.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.
Дзятлаўскі раён.

РАКУРС

Откровение Игоря Сукача,

или Где дешевле интернет — в Минске или в Москве?

В Беларуси доступ в интернет для рядового потребителя уже дешевле, чем в Москве. Таким заявлением директор компании "Атлант Телеком" **Игорь СУКАЧ** огорошил участников конференции "Деловой интернет", прошедшей в конце минувшей недели. До сих пор считалось, что доступ в интернет в Беларуси — самый дорогой в Европе и один из самых дорогих в СНГ. Неудивительно, что заявление Сукача вызвало, мягко говоря, неоднозначную реакцию белорусских пользователей Сети. А их в стране уже как будто 2,7 миллиона, то есть 40% взрослого населения.

По словам И. Сукача, в Беларуси самый дешевый доступ в Сеть можно купить меньше чем за 15 долларов, тогда как в Москве — примерно за 18 у.е. Конечно, в российской столице за эти деньги можно получить больше услуг, гораздо более высокую скорость передачи данных и т.д. Но это вопрос будущего, убежден Сукач.

Эту же точку зрения поддержал и представитель Минсвязи **Юрий ШПАК,** который сказал: *"Дальнейшее снижение цен — тупиковый путь. Цены на интернет у нас уже доступны для массового потребителя".*

Понять, что Сукач, скажем вежливо, несколько лукавит, очень просто. Достаточно посмотреть тарифы одного из крупнейших московских провайдеров — компании "МГТС" ("Московская городская телефонная сеть"). Неограниченный доступ в интернет на скорости 512 килобит в секунду (по белорусским меркам это быстрый доступ, по московским — так себе) стоит российскому абоненту 111 рублей — примерно 4,3 доллара в месяц. То есть где-то 9100 белорусских рублей.

Теперь сравним. Неограниченный доступ в интернет на той же скорости по тарифам



"Белтелекома" будет стоить около 600.000 рублей в месяц — 284 доллара! Самое дешевое подключение с неограниченным доступом, предлагаемое белорусам, стоит 60.000 рублей (28 долларов) в месяц — и это на черепашьей скорости 128 Кбит/с.

Игорь Сукач:

— Не надо путать понятия *"стоимость интернета"* и *"стоимость интернет-трафика"*, — говорит Игорь Сукач, — это разные вещи. Стоимость интернета для меня — это то, сколько абонент платит за услугу без учета ширины интернет-канала. А когда речь идет о стоимости интернет-трафика, имеется в виду получаемый абонентом за эти деньги набор услуг.

И я утверждаю, что стоимость интернета как услуги в Минске ниже, чем в Москве. Я привожу примеры: клиент московской "Корбины Телеком" не может подключиться к интернету дешевле, чем за 18 долларов. Это минимальный тариф данного провайдера. Минимальный тариф, который сформировался на рынке интернет-услуг Беларуси, — 14 долларов. И я утверждаю, что 14 меньше 18. А вот сколько я за эти деньги могу получить интернет-услуг — это уже другой вопрос. И вот тут я говорю: интернет-трафик будет дешеветь. Правда, для этого должны быть выполнены некоторые условия.

Как формируется стоимость интернет-услуг? Предположим, что оператор вообще берет интернет за нулевую стоимость. Но это не значит, что ноль будет и для конечного абонента, потому что компания строит инфраструктуру, которая сейчас стоит в перерасчете на одного абонента достаточно дорого. Кроме того, оператор занимается ее поддержанием.

Компания инвестирует в оптоволоконные кабели, которые укладываются в канализацию, в оборудование, которое она устанавливает на станциях или в домах, в свой центральный узел, который занимается перераспределением каналов. Оператор занимается и вопросами информационной безопасности для абонентов. Это основные статьи наших расходов.

Сейчас при минимальной стоимости интернет-пакета в 30 тысяч белорусских рублей абонент лишь окупает поддержание инфраструктуры. Если сделать эту границу еще ниже, наша работа станет экономически нецелесообразной.

Цена на интернет-услуги не может падать бесконечно. Она уже упала до минимальной отметки. [...] Я считаю, что стоимость минимальных интернет-пакетов дальше падать не будет. Предлагать тарифы стоимостью меньше 30 тыс. рублей не имеет смысла.

После заявления Игоря Сукача о том, что интернет в Минске уже дешевле, чем в Москве, белорусские интернет-форумы накрыла настоящая лавина гневных комментариев. Вот самые типичные:

— Это ж в городе за 15 у.е. можно подключиться, а на районе будьте готовы выложить в два раза больше. 30 у.е. стоит самый дешевый доступ от все того же "Белтелекома". Качество связи оставляет желать лучшего.

— А что вы все удивляетесь? Беззастенчивое вранье — конек белорусских чиновников. Факт: в Республике Беларусь самый дорогой доступ в интернет в Европе, на Ближнем Востоке и в Северной Америке вместе взятых.

— Я живу в России. Не знаю, как сравнивать, но у меня за 780 российских рублей интернет на скорости 100 мБит/сек + 80 цифровых каналов телевидения, в том числе высокой четкости. А более медленный, но все равно безлимитный доступ в интернет можно получить и за менее чем 10 долларов.

— Покажите мне неограниченный доступ в Минске за 15 долларов. Я пользуюсь "Космос-ТВ" — там 125.000 рублей (60 долларов) стоит самый дешевый неограниченный доступ с мизерной скоростью.

— "Белтелеком" всего за полгода снизил цену "Атланту" в сумме почти на 30%. А что получили мы, простые пользователи ? Кукиш! Г-н Сукач эти денежки просто "зажал".

Виктор ДЕМИДОВ.

Комментарий специалиста

Николай ЩЕТЬКО, редактор интернет-издания IT.TUT.BY:

— Что имел в виду Игорь Сукач в своем высказывании — это, наверное, знает только он сам. С моей точки зрения, речь шла о том, что пользователи могут подключить широкополосный интернет-доступ за достаточно небольшие деньги (30 тысяч рублей в месяц на byfly, Атлант Телеком) и успешно им пользоваться. Ведь 500 мегабайт включенного трафика будет вполне достаточно для не слишком искушенных пользователей.

Однако в Москве за практически те же деньги клиенты получают высокоскоростной доступ в интернет без каких-либо ограничений. Это связано с рядом особенностей именно московского рынка — например, с очень высокой конкуренцией между компаниями-провайдерами. Да, действительно, в ряде регионов России и в некоторых странах СНГ интернет дороже (порой — значительно дороже!), чем в Беларуси. Но ориентироваться мы все же должны не на них.

Адпачынак «на роды» можа стаць даўжэйшым

У Беларусі плануецца разгледзець варыянты дадатковага стымулявання нараджальнасці. Пра гэта паведаміла начальнік аддзела народанасельніцтва, сямейнай і гендэрнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Аляксандра Лісоўская.

Паводле яе слоў, з наступнага года плануецца павелічэнне дапамогі на догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў да 100 працэнтаў бюджэту пражытачнага мінімуму. Апроч таго, цяпер разглядаюцца варыянты выканання даручэння Савета міністраў аб прыняцці дадатковых захадаў стымулявання нараджальнасці.

Адна з прапаноў тут датычыцца павелічэння працягласці водпуску па цяжарнасці і родах на два тыдні. Адначасова плануецца вывучыць вопыт стымулявання нараджальнасці ў іншых краінах, у прыватнасці, праграму "мацярынскага капіталу". Праўда, сцвярджаць, што ён будзе ўведзены ў Беларусі, пакуль заўчасна.

СУД!

Не по-божески

В суде Первомайского района города Витебска начался процесс по уголовному делу в отношении водителя Витебского епархиального управления. Он обвиняется в совершении преступления, предусмотренного ст.209 ч.4 УК Республики Беларусь — завладение имуществом путем обмана и злоупотребления доверием (мошенничество), совершенное в особо крупном размере.

81-летняя жительница Витебска Галина Александровна Куприянова несколько лет назад занемогла: фронтовые раны дают о себе знать. О немощной старушке узнали в Свято-Покровском храме. Благо церковь недалеко от дома. Наверное, престарелая женщина надеялась хоть на какое-то душевное общение со служителями церкви. Так и случилось. Вскоре познакомилась с монахиней А., которая и стала ее навещать.

"Монашечка-чернушечка", внимательно выслушав исповедь прихожанки, подрядилась помочь в ее одиночестве. На следующий день в ее квартире уже хлопотала сердобольная затворница.

Бес попутал

Бабушка Галя души не чаяла в своих новых знакомых. Вскоре монашку сменил молодой человек. Он тоже был внимателен к хозяйке. И даже однажды поклялся, что готов до конца ее жизни быть для нее покорным слугой. Правда, при одном условии: Куприянова должна дать ему доверенность на право распоряжения квартирой. Может, Галина запамятовала, что несколько лет назад уже нотариально завещала свое жилище родной сестре Иде и племяннице Ирине, которые живут в Минске. Не исключена и другая версия, которую, кстати, и предстоит доказать или опровергнуть в суде под председательством судьи Натальи Кораблиной.

Пока суд да дело, наивная бабушка, хоть почти слепая, подписала какую-то бумажку. В тот же день "ксива" была скреплена печатью у нотариуса. Дальше события развивались стремительно, как по-щучьему велению. Непонятно пока, каким образом, но Галина Куприянова оказалась на социальной койке... В богадельне не уберегли пациентку: она там сломала шейку бедра. Одним словом, стала прикованной к постели. Непонятно и другое: ведь у Куприяновой были опекуны из соцзащиты Первомайского района г.Витебска, они от нее не отказывались, но это другая тема.

Соседи Куприяновой заподозрили неладное. Во-первых, Галина внезапно куда-то исчезла. Во-вторых, в ее жилище появились незнакомые люди, которые были не очень-то разговорчивые. Пришлось позвонить в Минск родственникам Куприяновой.

Не по-людски

...К этому времени входная дверь в квартире Куприяновой уже была металлическая. Минчане — мама с дочкой — попытались зайти в жилище родственницы, но на пороге им преградила путь дородная дама. Подбоченясь, она громогласно заявила: "Я здесь полновластная хозяйка!"

На вопрос, где Галина Александровна, услышали: "Там, где надо!" И дверь захлопнулась наглухо. Ничего не оставалось делать, как вызывать милицию.

Дальнейшие события развивались не по библейским канонам, а по законам криминального жанра. В присутствии понятых в квартире Галины Куприяновой оперативники тщательно провели осмотр. Никаких посторонних предметов или вещей, не принадлежащих хозяйке (кроме двери), обнаружено не было.

Следствием установлено, что молодой человек (назовем его Геннадий), используя упомянутую выше доверенность, продал квартиру Галины Куприяновой своей теще. Отметим, что сначала он давал показания, мол, Куприянова подарила ему квартиру. Затем признался, что "однокомнатку" выкупила теща за 40 миллионов белорусских рублей. И кучу денег вручила хозяйке, и эти деньги надо искать у нее под подушкой. Действительно, при повторном осмотре квартиры в шкафу на видном месте уже появился пакет с белорусскими банкнотами. Похоже, оперативники допустили оплошность, не опечатав "арестованную квартиру" и предоставив возможность доступа посторонним лицам. В итоге, по результатам проведенной проверки было возбуждено уголовное дело по факту мошенничества.

По утверждению Ирины Куприяновой, из секретариата Витебской епархии звонили в Минск с просьбой замять дело, дескать, нежелательно пятно на авторитете ведомства. Звонила трижды и монахиня Анна, настаивала забрать "позорное заявление из суда". Более того, радостно поведала, что когда-то свою квартиру подарила епархии и об этом ничуть не жалеет. И мол, не гневите Бога.

Воистину благой поступок. Никто не стал бы упрекать того же Геннадия, если бы он распорядился своим особняком так же, как и его соратница по духу. Или тремя автомобилями: "Мерседес-Бенц 500", "Мерседес-Бенц 230Е", "Ауди А6". Кстати, на все иномарки наложен арест. И по решению суда автомобили могут быть конфискованы. Ходатайство Архиепископа Витебского и Оршанского Дмитрия о снятии ареста с автомобилей, так как они принадлежат Витебскому епархиальному управлению, но во время покупки были оформлены в ГАИ на водителя Геннадия в связи с упрощенной схемой оформления на частное лицо, — отклонено следствием.

Но в данном случае речь о другом. И не надо путать Божий дар с яичницей.

На первом судебном заседании обвиняемый отказался сотрудничать с судом и не стал давать никаких показаний. Как пояснил представитель потерпевшей (известный правозащитник из Международной ассоциации защиты прав человека (HRD)) Андрей Валентинович Демидович, "каприз" обвиняемого понятен: необходимо "потянуть кота за хвост". Но правосудие не подвластно, надо полагать, церковным канонам.

Выводы правозащитника предельно ясны. Хотя и не надо забывать, что в нашем государстве церковь на особом положении.

Владимир ЖИГУЛОВ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ЗАПРАШЭННЕ

...Каму неабыякавы лёс Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Дваццаць гадоў таму адбыліся першыя агульнанацыянальныя "Дзяды", якія назаўсёды ўвайшлі ў гісторыю. Тысячы людзей з усёй Беларусі сабраліся тады каля мінскіх Усходніх могілак, каб ушанаваць памяць продкаў, якія жылі на гэтай зямлі, захоўвалі яе духоўныя скарбы, баранілі ад ворагаў, гінулі за яе свабоду і незалежнасць.

Нягледзячы на жорсткі супраціў камуністычнай улады, Дзяды-1988 ускалыхнулі грамадства, далі яму новыя ідэі і арыенціры. Менавіта ў той дзень падчас мітынгу па дарозе на Курапаты ўпершыню за некалькі дзесяцігоддзяў быў узняты белчырвона-белы сцяг, які неўзабаве стаў дзяржаўным сцягам незалежнай Беларусі.

Сённяшняя ўлада робіць новыя спробы знішчыць гістарычную памяць беларусаў, збудаваць у нашай свядомасці "лінію Сталіна". Але мы ведаем, адкуль наш род. У нас 1000-гадовая гісторыя, і мы памятаем яе герояў. Яны даюць нам прыклад, умацоўваюць веру ў дэмакратычную еўрапейскую будучыню.

Заклікаем усіх, каму неабыякавы лёс Беларусі, сабрацца 2 лістапада каля Усходніх могілак, каб ускласці кветкі на магілы Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Генадзя Карпенкі і іншых нашых славутых суайчыннікаў, а потым прыйсці да святых Курапацкіх крыжоў.

Уладзімір АРЛОЎ,
Рыгор БАРАДУЛІН,
Генадзь БУРАЎКІН,
Аляксей МАРАЧКІН.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Валерый ШЧУКІН: «Не хочуць рэгістраваць нават як бамжа»

Днямі ў рэдакцыю патэлефанаваў чытач, які пацікавіўся лёсам вядомага беларускага праваабаронцы Валерыя Шчукіна.

Шчукін бадай што самы вядомы ў Беларусі чалавек без вызначанага месца жыхарства. Вось ужо больш за чатыры гады ён жыве на чыгуначным вакзале.

"Ці праўда тое, што віцебскія ўлады нарэшце пашкадавалі Шчукіна і выдзелілі яму пакой у інтэрнаце?" — цікавіўся ў нас чытач.

Мы адрасавалі гэтае пытанне самому Валерыю Аляксеевічу. "Не, ніякага пакою мне ніхто не прапаноўваў, — распавёў карэспандэнту "Народнай волі" Шчукін. — Я, здаецца, абышоў усе магчымыя і немагчымыя інстанцыі, але паўсюль атрымоўваю адпіскі, з якіх вынікае, што мяне зрабілі бамжом законна... Я неаднаразова дабіваўся асабістай сустрэчы з кіраўніком Віцебскай вобласці Уладзімірам Андрэйчанкам, але той мяне нават бачыць не захацеў.

Самае цікавае ў іншым. Як вядома, у нашай краіне існуе заканадаўчая норма, згодна з якой бамжы павінны рэгістравацца. Дык я вам скажу, што мяне нават бамжом не рэгіструюць. Я быццам бы ёсць, але мяне ў той жа час няма. Паколькі я нідзе не зарэгістраваны, то і галасаваць не магу. Я бадай што адзіны ў Беларусі чалавек, які пазбаўлены права голасу. Хаця ў нашай краіне галасуюць нават арыштанты і пацыенты "псіхушак"..."

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Чытачы "Народнай волі" працягваюць выказвацца наконт таго, як у нашай краіне праходзілі парламенцкія выбары

Што паказвае мая выбарчая арыфметыка...

Каманда Ярмошынай падлічыла вынікі парламенцкіх выбараў. Здавалася б, зноў-такі "элегантная" перамога. Але нешта не хочацца верыць у афіцыйныя лічбы.

Вось я пачаў аналізаваць іх, і ўзніклі пэўныя пытанні. Возьмем, да прыкладу, лічбы афіцыйнай статыстыкі. Агулам прагаласавала 75,3 працэнта выбаршчыкаў. Пры гэтым датэрмінова прагаласавалі 26,3 працэнта, зноў-такі ад агульнай колькасці выбаршчыкаў. З гэтага вынікае, што датэрмінова галасавалі 35 працэнтаў з тых, што бралі ўдзел у выбарах (26,3:75,3х100=34,9).

Ведаючы, у якой краіне жыву, дазволю сабе лічыць (умоўна), што ў датэрміновым галасаванні бяруць удзел выключна "добранадзейныя" грамадзяне. Такім чынам, можна лічыць (умоўна), што ўсе, хто галасаваў датэрмінова, на 100 працэнтаў падтрымалі кандыдатаў ад улады. З гэтага раблю выснову, што кожны праўладны кандыдат атрымаў (у сярэднім па краіне) ужо на стадыі датэрміновага галасавання "падарунак" у 35 працэнтаў галасоў актыўных выбаршчыкаў. Калі так, то для "бліскучай" перамогі ім дастаткова было б набраць "усяго" 15 працэнтаў галасоў тых, хто прыйшоў 28 верасня на выбарчыя ўчасткі.

Гэта складае 11,3 працэнта ад агульнай колькасці ўсіх выбаршчыкаў краіны (15х75,3:100=11,3). Вось, здавалася б, цудоўная нагода для ўлады, каб паказаць прыклад дэмакратычнасці выбарчага працэсу ў Беларусі! Сапраўды, навошта ўвесь гэты "цырк" ды сакрэтнасць з падлікам галасоў? Дапускай у апошні дзень галасавання прадстаўнікоў міжнародных арганізацый да падліку галасоў, пакажы, як праўладныя кандыдаты набіраюць "няшчасныя" 15 працэнтаў галасоў, і няхай увесь свет бачыць, як мы можам "элегантна" перамагаць!

Стоп! Вось тут якраз у мяне ўзнікае пытанне да Ярмошынай, Лазавіка і ўсіх "усенароднаабраных". Няўжо ж вы і гэтых "няшчасных" 15 працэнтаў (11 працэнтаў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў) галасоў не ў стане назбіраць? Калі гэта так, то становіцца зразумелым, чаму падлік галасоў на выбарах з'яўляецца "дзяржаўнай таямніцай". А грамадзян Беларусі можна "павіншаваць" у гэтым выпадку з парламентам, які рэпрэзентуе інтарэсы менш як 11 працэнтаў насельніцтва краіны. Калі гэтыя мае высновы абгрунтаваныя, а просты арыфметычны падлік паказвае, што гэта так, то становіцца зразумелым, чаму грамадзян пазбаўляюць ільгот, "душаць" прадпрымальнікаў, разганяюць дубцамі мірных дэманстрантаў. Дэпутатаў Нацыянальнага сходу прапаную ніколі не называць "народнымі абраннікамі", а лепш "прадстаўнікамі інтарэсаў вузкіх колаў беларускага грамадства". А беларускай апазіцыі хачу дадаць аптымізму, бо з гэтых лічбаў вынікае, што фактычна 89 працэнтаў насельніцтва краіны, калі нават і не сімпатызуюць апазіцыі, тым не менш палітыкай кіраўніцтва краіны незадаволеныя!

Павел АБУХОВІЧ,
жыхар г.Гродна.

ИЗ ПИСЬМА

Нужны публичные дебаты

В Америке, помнится, примерно два месяца пересчитывали голоса, а у нас, где демократии больше, чем в США и Европе вместе взятых, тем более, казалось бы, это нужно сделать. Выборы не должны закончиться обнародованием сомнительных результатов.

Оппозиции нужно требовать эфир, чтобы вступить в публичные дебаты с властью.

З.Р.СЕНЬКО,
житель г.Мозыря.

На словах...

"Мы хотим продемонстрировать и Западу, и России, как надо проводить выборы. Мы их сделаем настолько демократичными, что вы убедитесь в реальном результате, кого сегодня поддерживает народ".

(Александр Лукашенко в интервью газете "Комсомольская правда" 24 июня).

Что это как не манипуляция?

Уже много писали о том, как у нас проходят "выборы" без выбора. И я хочу дополнить это утверждение своим наблюдением.

В основной день выборов, 28 сентября, я побывала в двух продуктовых магазинах, что на бульваре Шевченко, и в каждом из них видела фото одного из кандидатов в депутаты (а фото трех других не было). Понятно, что был вывешен портрет кандидата, угодного власти. Считаю, что был использован хитрый пиаровский ход: пенсионеры, посещающие магазин, невольно запоминали именно его фамилию и, не исключено, голосовали за того, кого "знают". Что это как не манипуляция общественным мнением?

И еще. Меня очень удивил тот факт, что, как сообщили СМИ, в новый парламент "прошли" примерно 30 бывших депутатов. Вот только непонятно: за что их избрали на новый срок — ведь они ничего для своих избирателей хорошего не сделали. Одна только отмена льгот чего стоит!

И я не верю, что за них голосовали повторно, просто они, видимо, очень угодны власти, которая их в очередной раз "протащила". Так откуда может быть доверие к таким "выборам"?

Розалия РУБИНЧИК,
пенсионерка.
г.Минск.

P.S. И потому, видимо, не случайно в эту избирательную кампанию почти не было встреч с избирателями — потому что все уже было известно заранее...

4 октября отмечался Всемирный день защиты животных. Но кого это волнует, когда у нас люди беззащитны.

Сустрэнемся 2 лістапада

Кансерватыўна-Хрысціянская Партыя — БНФ падала заявы ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і Мінскі абласны выканаўчы камітэт для правядзення 2 лістапада 2008 г. традыцыйнага вулічнага шэсця ў г.Мінску і мітынгу ва ўрочышчы "Курапаты" Мінскага раёна, прысвечаных Дню памяці продкаў "Дзяды".

Плануецца такі расклад: пачатак шэсця ў Мінску ў 11.00 ад Гадзіннікавага завода да кальцавой дарогі, заканчэнне шэсця ў 14.30; мітынг у "Курапатах" — з 14.30 да 17.00.

Адказныя за правядзенне мерапрыемства намеснік старшыні Партыі Сяргей Папкоў, адказны сакратар Управы Сойму Аляксандр Чахольскі.

Алесь ЧАХОЛЬСКІ,
сакратар Управы Сойму КХП—БНФ.

ДЫСКУСІЯ

Праца, якая заслугоўвае пахвалы



У апошні час на маю электронную пошту прыходзяць лісты ад маладых сяброў Беларускага руху. Пытаюцца пра Васіля Якавенку ў сувязі з нядаўняй публікацыяй у "Народнай волі" ліста гэтага аўтара, дзе крытыкуецца мая асоба ("Дазвольце не пагадзіцца...", "Народная воля", 2008, 3 кастрычніка.) Шчыра кажучы, не маю ніякай ахвоты пісаць на гэтую тэму, каментаваць гэты ўзровень і марнаваць час на пустое. Я не адказваў нават камуністам. Проста рабіў сваю справу далей. Цяпер, праўда, вырасла новае пакаленне ў неспрыяльных умовах, і трэба ўсё ж нешта сказаць.

Ліст В.Якавенкі вымоўны і па стылі, і па думках, і нават па цытатах. Аўтар пры нагодзе выказваецца ў мой адрас у гэтым стылі ўжо 20 гадоў. Не бачу ніякай патрэбы ўдакладняць ягоныя крыўдлівыя дакоры. Тым больш што па сутнасці падзеі няма прэтэнзій. Я сапраўды паставіў пытанне аб выгнанні Якавенкі з Аргкамітэта БНФ за антыфронтаўскія дзеянні, паводзіны і публікацыі. І Аргкамітэт з ім развітаўся.

Праблема, аднак, была шырэйшай, пра якую ў Фронце ведалі далёка не ўсе. Умоўна яе можна назваць кшталтам "Пазбаўленне ад агентуры". Калі б гэтая праграма не дзейнічала і калі б я ёю не цікавіўся, то Фронт разбавілі б, растварылі б і патапілі б у самым пачатку.

Якавенка прыйшоў не адзін, адразу прывёў з сабой прыгожую маладую сакратарку, якая пісала ўсе пратаколы Аргкамітэта і добра гаварыла па-беларуску. Толькі ніхто яе датуль не ведаў. А калі даведаліся — аказалася жонкай афіцэра КДБ, якая прысутнічала ў Фронце, як кажуць, "па сумяшчальніцтве". (Потым яна займалася бізнесам, а пазней, ужо за гэтым рэжымам, працавала на Радыё Свабода журналісткай і фігуравала ў якасці палітычнага ўцекача, якога быццам бы пераследуе рэжым Лукашэнкі. Цяпер працуе ў Празе шэф-рэдактарам чэшскай версіі крамлёўскага часопіса "Россия в глобальной политике", добра гаворыць па-чэшску.)

Наступным пратэжэ Якавенкі быў такі суб'ект па прозвішчы Жураўлёў. Фронт, паверыўшы рэкамендацыі, ледзь жылы не парваў, агітуючы і штурхаючы яго ў Вярхоўны Савет СССР. Калі разабраліся, было ўжо па часе. Жураўлёў стаў народным дэпутатам СССР ад БНФ (і ён там "навыступаў"). Прыводзілі іншых "змагароў за свабоду" (з трыма літарамі ў вачах, як у Пуціна), якіх даводзілася адшываць з парога.

Васіль Быкаў у "Доўгай дарозе дадому" апісваў, як у самым пачатку Аргкамітэта БНФ да яго на кватэру прыйшлі Алесь Емяльянаў і Васіль Якавенка і пачалі гаварыць пра неабходнасць лідэрства ў Фронце. Размова скончылася тым, што Быкаў сказаў Якавенку: а чаму б яму самому "не зрабіць тое"? Так Якавенка, з падачы Васіля Уладзіміравіча, стаўся каардынатарам і пачаў праяўляць актыўнасць у змаганні за "перабудову" з лепшымі сіламі КПСС, мяркуючы, што "перестройка — наша судьба". (У мяне ўзнікла адчуванне, што ён яшчэ і цяпер так думае.)

Алесь Емяльянаў (пазней сябра Сойму БНФ) на пачатку Фронту рабіў шмат карыснай кардынацыйнай працы. Быў адданым беларусам. Летам 1991 года ён не вытрымаў падвойнага жыцця, з'явіўся ў рэдакцыю газеты "Свободные новости" і заявіў пра сваё супрацоўніцтва з КДБ. Матэрыял у газеце так і называўся: "Я был сексотом КГБ" ("Свободные новости", 1991, чэрвень, №10, с.7). Гэта было палітычнае харакіры, але застацца сумленным чалавекам і беларусам для Емяльянава было вышэй. І, трэба сказаць, фронтаўцы па-чалавечы ўспрынялі і зразумелі ягоны ўчынак. Пасля смерці ўспомнілі яго добрым і шчырым словам.

Але, на жаль, такі сумленны рахунак зрабіў толькі адзін Емяльянаў. Шэраг іншых "дэмакратаў", па ўсім відаць, будуць жыць са сваім цяжкім грузам да смерці.

Ужо заўважана, як некаторыя з гэтай публікі ("апазіцыянераў" ды "дэмакратаў") пры ўпамінанні майго імя трацяць раўнавагу, сціскаюць зубкі і кулачкі. Але дарэмна непакояцца таварышы. Усё ж такі ім моцна пашанцавала з прэзідэнтам і вярхоўным начальствам. У адваротным выпадку ўступіў бы ў дзеянне закон аб люстрацыях, і пасыпаліся б яны, як гарох. Зрэшты, усё яшчэ наперадзе. Усё лепшае — перад намі.

Post Skryptum

Некалькі слоў з нагоды адкрытага ліста да мяне спадарыні І.В.Кісялёвай у гэтым жа нумары "Народнай волі".

Паважаная Ірына Васільеўна, на жаль, Вы ўсё пераблыталі. І справа не ў тым, што Вас падвяла памяць, проста Вы не былі глыбока ўлучаныя ў веданне справаў, якімі займаўся Народны Фронт, і пішаце па звестках аб падзеях, да якіх не мелі непасрэднага дачынення.

Чарнобыльскі камітэт Беларускага Народнага Фронту "Дзеці Чарнобыля" быў створаны ў Фронце ў красавіку 1989 года. Узначаліў яго Мікола Купава. Ён пачаў гэтую справу. Праз месяц у Фронт прыйшоў Генадзь Грушавы, які пераняў гэтую дзейнасць. Менавіта Генадзь Грушавы вывеў фронтаўскі Камітэт на міжнародны ўзровень і стварыў з яго самую моцную дапамагаўчую чарнобыльскую арганізацыю ў Беларусі. Праз нейкі час Камітэт адпачкаваўся ад Фронту і стаў дзейнічаць самастойна (1991 г.). Усё гэта напісана ў кнізе "Беларусь у сэрцы" (стар.53). Вы гэтай старонкі, магчыма, не прачыталі. Адпачкаванне не было наступствам нейкіх супярэчнасцяў з БНФ, але вынікам інтэнсіўнага і натуральнага росту арганізацыі. Ёй стала цесна ў рамках Фронту. І мы разумелі гэта.

Тым часам Фронт меў дастатковыя людскія рэсурсы і магчымасці, каб і надалей працягваць пачатую ім справу. Такім чынам у 1993 годзе ў БНФ была створана і зарэгістравана ў Мінску новая чарнобыльская арганізацыя, якая называлася "Камітэт "Дзеці Чарнобыля" БНФ". Яго ўзначаліла Галіна Пазьняк (Вашчанка). Пры ўзаемадзеянні і пры арганізацыйнай падтрымцы Фронту дзейнічалі іншыя чарнобыльскія арганізацыі, напрыклад, "Сакавік" у Мінску (кіраўнік Марыя Міцкевіч), ці, напрыклад, вельмі моцная чарнобыльская арганізацыя была створана ў гэты час у Магілёве (кіраўнік — сябра Сойму БНФ Наталля Рослава) і іншыя арганізацыі.

Будучы ў чарнобыльскай структуры арганізацыі Тамары Белавокай, Вы павінны былі добра ведаць гэтыя фронтаўскія арганізацыі, а не пісаць, што нічога не ведалі. Але калі сапраўды не ведалі, то гэта ёсць Ваша асаблівасць. Аўтар тут ні пры чым. Фронт не толькі падняў праблему Чарнобыля і прымусіў вырашыць яе заканадаўча ў Вярхоўным Савеце. Фронт даў прыклад дзейнасці ў аздараўленні дзяцей і ратаваў іх ад занядбання. Гэта потым дапамаговая дзейнасць пачала пашырацца ў грамадстве па ўсёй Беларусі.

Як сябра дэпутацкай Камісіі па Чарнобылю Вярхоўнага Савета, як старшыня Фронту і як старшыня дэпутацкай Апазіцыі БНФ у парламенце я вельмі шчыльна курыраваў чарнобыльскую справу ў Фронце, ездзіў глядзець, як вядзецца нашым чарнобыльскім дзецям, нават у Нямеччыну, не кажучы ўжо па Беларусі.

Мне здаецца, Ірына Васільеўна, што Вы ўзялі вельмі самаўпэўнены тон, гаворачы пра рэчы, арганізатарам якіх было кіраўніцтва БНФ і да якіх Вы мелі вельмі ўскоснае дачыненне альбо не мелі ніякага (у лепшым выпадку, магчыма, прысутнічалі альбо нешта чулі). Вы, па ўсім вадаць, адчуваеце сябе не тое што нароўні, а высока нада мной, калі кажаце, што ўсе мастакі працуюць, "не баючыся таго рэжыму, у які Вы з Галінай баіцеся вярнуцца". І сапраўды, веру, чаго Вам баяцца? Не страшны Вам ніякі рэжым.

Вы, на жаль, не разабраліся ў жанры кнігі Галіны Пазьняк і папракаеце аўтара, што, "прэтэндуючы на летапіс усяго фронтаўскага руху", яна "спынілася чамусьці толькі на сваім Камітэце".

Гэта не "летапіс", Ірына Васільеўна, гэта ўспаміны непасрэднага ўдзельніка падзей, суб'ектыўна прапушчаныя праз сэрца, успаміны простыя і па-жаночаму шчырыя, з вялікай любоўю да Беларусі. І ў гэтым іх прыцягальнасць для добрых людзей. У гэтым ёсць іх сваістая каштоўнасць для мемуарнай літаратуры, што, дарэчы, падкрэслена мной у прадмове.

Магчыма, Вы пачуліся пакрыўджанай, што аўтар "спынілася чамусьці толькі на сваім Камітэце", як Вы пішаце. Але ж пісаць пра іншае — гэта не задача аўтара і не праблема жанру. Аўтар апавядае пра сваю дзейнасць, пра абставіны, у якіх гэтая дзейнасць адбывалася, і пра тое, што сама бачыла.

Мне здаецца, Вы размінуліся са справядлівасцю ў сваіх абвінавачваннях, папракаючы мяне ў тым, што я ўхваліў гэтую добрую кнігу. І ўхваліў, і аформіў, і выдаў, бо яна вартая дзеля нашай культуры і заслугоўвае пахвалы.

Зянон ПАЗЬНЯК.

ПРАТЭСТ

Ці змогуць беларусы карыстацца слухаўкамі на сваёй мове?

Паважаная рэдакцыя газеты "Народная воля"! Мушу закрануць важную для Беларусі тэму — "беларусізацыя" мабільных тэлефонаў.

За дзевяць гадоў шырокага распаўсюджвання мабільных тэлефонаў на Беларусі іх так і не адаптавалі да нас, не зрабілі меню на беларускай мове! Абсурд, ды і толькі! Дагэтуль Беларусь застаецца, напэўна, адзінай краінай у Еўропе, для якой не вырабляюцца мабільныя тэлефоны з меню на нацыянальнай мове. Гэта непавага, нават абраза нашай краіны, пагляд на яе з боку транснацыянальных карпарацый, што вырабляюць побытавую тэхніку, проста як на тэрыторыю для збыту сваіх тавараў. У шырокім сэнсе слова — гэта абмежаванне правоў грамадзян: беларусы ж нават не маюць магчымасці атрымліваць такую паслугу ў сваёй краіне на сваёй мове!

У шматлікіх установах, куды я звяртаўся па гэтым пытанні, з іх лістоў я чуў ці чытаў паміж радкоў знаёмую песню: маўляў, *"в РБ приняты два государственных языка — русский и белорусский, каждый может выбирать, какой хочет. Поэтому мы на белорусском говорить не будем и делать для его употребления ничего не будем!"* Інакш кажучы, прызнаецца, што беларуская мова ў сваёй краіне знаходзіцца фактычна ў паўзабаронена-паўпрыдушаным стане. Няма абвешчанай паводле рэферэндуму 1995 года *"роўнасці"*, бо руская мова не проста дамінуе ў гэтай сферы, а поўнасцю, на 100 працэнтаў захапляе яе!

Нягледзячы на больш як 70-гадовае панаванне на тэрыторыі Беларусі камуністычнага рэжыму, які праводзіў актыўную палітыку русіфікацыі, згодна з апошнім перапісам насельніцтва Рэспублікі Беларусь 1999 года беларускую мову лічаць роднай 81,9 працэнта жыхароў. І хоць значная колькасць насельнікаў краіны размаўляе па-руску, беларуская мова з'яўляецца зараз пэўным чынам элітарнай, ёю карыстаюцца паўсядзённа найбольш адукаваныя, інтэлектуальныя, "прасунутыя" людзі.

І не дзіўна, што з развіццём сотавай сувязі, пашырэннем кола карыстальнікаў з'яўляюцца спажыўцы, якія хацелі б карыстацца слухаўкамі менавіта на сваёй мове. Я, напрыклад, без цяжкасцяў знайшоў толькі сярод сваіх блізкіх сваякоў, знаёмых і сяброў з паўтара дзесятка чалавек, што актыўна падтрымліваюць маю пазіцыю. А колькі іх у Беларусі?

Пра тое, што попыт на беларускамоўныя слухаўкі існуе, сведчыць факт, што на нашым рынку ўжо пэўны час (мне вядома, больш за год) аматарамі-праграмістамі (на жаль, саматужна) праводзіцца беларусізацыя тэлефоннага софту.

Не раз звяртаўся да афіцыйных дзяржаўных органаў, што рэгулююць дзейнасць у галіне мабільнай сувязі і сотавых апаратаў (Мінсувязі, Дзяржстандарт і інш.). Прыходзілі фактычна бюракратычныя адпіскі, а якісьці захадаў зроблена не было.

Апошнім разам я звярнуўся ў Канстытуцыйны суд за кансультацыяй, як карыстацца дзяржаўнай беларускай мовай у гэтай сферы, паколькі парушаюцца мае правы спажыўца. У лісце-адказе было сказана, што Канстытуцыйны суд разглядаў пытанні выкарыстання беларускай і рускай моў у сферы абслугоўвання, абароту банкаўскіх пластыкавых картак, на Беларускай чыгунцы, пры маркіроўцы тавараў і г.д. і ў сваіх рашэннях выклаў пазіцыю па пытанні забеспячэння фактычнай роўнасці дзвюх дзяржаўных моў. А для рэалізацыі і правапрымяльнай практыкі параіў звярнуцца ў Савет міністраў. І толькі пасля ліста апошняму з Міністэрства сувязі і інфарматызацыі прыйшоў адказ, што гэтае міністэрства *"поручило УП "Гипросвязь" проработать с основными производителями аппаратов телефонных сотовой подвижной электросвязи вопрос о включении белорусскоязычного программного обеспечения"*.

Як бачым, шанц на беларусізацыю ў рэшце рэшт дадзены! Але прайшоў не адзін месяц, а беларускамоўныя слухаўкі так і не з'явіліся...

Што да недзяржаўных арганізацый, датычных сотавай сувязі, то іх таксама няблага паварушыць.

У Беларускім таварыстве абароны спажыўцоў мне літаральна з парогу паведамілі: *"Нет, мы ничем здесь помочь не можем... К нам уже обращались граждане с желанием объявлять сообщения у компании "МТС" на белорусском языке. Мы их послали... в эту компанию"*.

ЗП "Мабільная лічбавая сувязь" (гандлёвая марка "Velcom") — больш уплывовая сотавая кампанія, якая першай пачала шырока забяспечваць мабільную сувязь на Беларусі і першай даўно зрабіла беларускамоўную версію свайго інтэрнет-сайта, раней размяшчала сваю рэкламу на нацыянальнай мове, з'яўляецца таксама афіцыйным дылерам па продажы тэлефонных апаратаў. Яна праводзіць акцыі па распаўсюджванні слухавак. Гэтая кампанія пазначыла, што мае намер праінфармаваць асноўныя кампаніі-вытворцы слухавак, з якімі супрацоўнічае, *"пра тое, што магчымасць выбару беларускай мовы ў меню мабільных тэлефонаў можа мець поспех у пэўнай часткі спажыўцоў у Рэспубліцы Беларусь"*.

Пэўным лідэрам на беларускім рынку слухавак з'яўляецца паўднёвакарэйская карпарацыя Samsung. Яна мае адно з вядучых месц па продажы і сертыфікавала не асобныя свае мадэлі, а і саму вытворчасць. Фактычна лідзіруе ў *"беларусізацыі"*: ужо працяглы час трывала дае слоганы сваёй прадукцыі ў вонкавай, тэлевізійнай рэкламе на мове карэннай нацыі нашай краіны. Тут жа заўважу, што ў карпарацыі Samsung ёсць патэнцыял у гэтай сферы: яшчэ ў сярэдзіне 2005 г. у сеціве на некалькіх сайтах з'явілася інфармацыя, што Samsung збіраецца беларусізаваць софт сваіх слухавак. Але потым стала вядома, што карпарацыя чамусьці адмяніла свае планы.

Раней я сам пісаў непасрэдна ў галоўныя офісы асноўных карпарацый, што вырабляюць тэлефонныя апараты — Samsung, Sony Ericsson, Nokia, Siemens, Motorola. Большасць гэтых кампаній нават не далі мне адказ — мабыць, палічылі, што беларускіх спажыўцоў на Беларусі мала і не варта гэтым займацца. **Думаю, калі б гэтаму вырабніку прыйшло шмат лістоў з патрабаваннямі ад спажыўцоў, гэта дапамагло б зрушыць сітуацыю.**

І вось ад шведскай кампаніі Sony Ericsson са скрынкі questions.pl@support.sonyericsson.com мне прыйшоў цікавы беларускамоўны адказ: *"Без сумніву, мы поўнасцю згодны з Вамі, што ўся прадукцыя для Беларусі павінна падтрымліваць беларускую мову. Наша кампанія заўжды спрабуе вырабляць прадукцыю, прыязную для нашых кліентаў. І мы разумеем, што меню і Кіраўніцтва для карыстальніка на роднай мове нашых кліентаў ёсць адной з найважнейшых падстаў дзеля дасягнення гэтай мэты. Галоўнай прычынай, чаму нашы слухаўкі не падтрымліваюць беларускую мову, ёсць тое, што мы не маем да гэтага часу афіцыйнага прадстаўніцтва нашай кампаніі на Беларусі... Наша кампанія вельмі жадае змяніць гэтую сітуацыю, і мы спадзяёмся, што ў 2008 г. Sony Ericsson прыйдзе і выведае беларускі рынак афіцыйным шляхам"*.

Ёсць пэўная падтрымка і з боку кіраўніцтва беларускіх прадстаўніцтваў Samsung. Гарантыйны квіток да манітора Samsung, які мы набылі ў сакавіку 2007 года, ужо быў у тым ліку і на беларускай мове!

Беларусізацыя тэлефоннага софту, на маю думку, хутчэй за ўсё адбылася б праз кампанію Samsung. Пераклад тэкста праграмы можна было б зрабіць з дапамогаю ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны".

Пад канец хачу звярнуцца да чытачоў газеты з просьбаю даслаць лісты (пажадана на англійскай мове замоўным пісьмом) у кампанію Samsung як найбольш "прасунутую" ў гэтым пытанні па адрасе:

Samsung Electronics Co. Ltd
Samsung Main Bldg.,
250 Taepyung Ro, 2Ga, Chung Ku,
Seoul
KOREA, 100 742,

а таксама ў кампанію Sony Ericsson па адрасе:

Telefonaktiebolaget LM Ericsson
TORSHAMNSGATAN 23, KISTA
164 83 STOCKHOLM
SWEDEN

з просьбаю распрацаваць софт для мабільных тэлефонаў на Беларусі на беларускай мове.

Выказаць свае меркаванні па гэтым пытанні, а таксама атрымаць ангамоўны тэкст ліста вы можаце, калі напішаце мне на e-mail via123cheslav@tut.by.

Вячаслаў КУЧУК,
беларус.
Мінск.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

ОПЫТ СЛОВАКИИ

Доля экспорта

В последнее время все большую популярность за рубежом стали приобретать товары, произведенные в Словакии. Наибольшим спросом в европейских странах пользуются автомобили. Увеличение экспортных поставок регистрируют и другие отрасли словацкой промышленности.

Если 5 лет назад доля словацкого экспорта составляла примерно 70 процентов от производимой продукции, то сейчас этот и без того солидный показатель еще более возрос: доля экспорта в 2008 году составляет около 80 процентов.

Самым большим экспортером продукции является братиславский филиал немецкого автомобильного концерна "Фольксваген". В первой десятке экспортеров находятся предприятия таких известных фирм, как "Вирпул" и "Самсунг". Словацкий экспорт возрастает за счет зарубежных фирм.

По мнению экономиста "Чехо-словацкого торгового банка" Петра Дуфека, растущие показатели экспорта помогают развивать не только производственные мощности предприятий, но и укреплять рынок труда, повышая уровень занятости. Новые рабочие места сопряжены прежде всего с ростом заработной платы и повышением жизненного уровня словаков.

Многие аналитики ожидают, что уже через год или два реальные показатели экспорта продукции словацких предприятий еще возрастут. Это будет связано с тем, что на полную производственную мощность выйдут новые автмобильные предприятия — ПСА "Пежо-Ситроэн" и "Хендай". Если сейчас в Словакии производится около 600 тысяч автомобилей, то в будущем году эта цифра должна возрасти до 800 тысяч автомобилей. И все же нельзя забывать о том, припоминают экономисты, что главным фактором возрастания экспорта в Словакии является весьма низкий, по сравнению с ведущими европейскими странами, уровень заработной платы в стране. Поэтому для западных фирм здесь выгодно создавать новые производственные мощности.

Но в ближайшем будущем ситуация может кардинальным образом измениться. Поэтому правительство уже думает над комплексной программой развития производственного потенциала республики. Главный упор в этой области делается на подготовку персонала, способного производить высокосложные в технологическом плане товары. Такой путь может стабилизировать экономический рост в стране на долгую перспективу.

Сергей ИВАНОВ.

КОРОТКО

Первая индийская святая

Папа Римский Бенедикт XVI провел церемонию канонизации первой индийской святой сестры Альфонсы, умершей в возрасте 36 лет в 1946 году, сообщает AFP. Церемония прошла в Ватикане в присутствии десятков тысяч верующих. По словам сестры Силии, эта канонизация является важной для францисканского ордена, к которому принадлежит святая, в условиях гонения христиан в Индии.

Берлин признан европейской столицей с самыми безопасными дорогами

Европейский совет по безопасности дорожного движения опубликовал показатели аварийности в столицах стран Евросоюза. Согласно этим данным, в прошлом году в Берлине из расчета на 100 тысяч горожан в результате ДТП погибли 1,64, в Париже — 1,70, а в Хельсинки — 1,93 человека. Всего же в среднем в столицах европейских государств квота жертв дорожно-транспортных происшествий составила 3,95 человека.

Самыми опасными оказались дороги в столице Словении Любляне, где в прошлом году погибли 12,98 человека из расчета на 100 тысяч жителей города. Оставляет желать лучшего и безопасность на дорогах столицы Латвии Риги, где в прошлом году жертвами ДТП стали 9,69 человека, словацкой Братиславы — 6,57, а также польской Варшавы — 6,45. Единственным столичным городом, где с 2001 года вообще не зарегистрирован ни один погибший в результате дорожно-транспортного происшествия, стала столица Мальты Валлетта.

ФОТОВЗГЛЯД



На выставке в Японии показали роботов, которые умеют кататься на велосипеде.

Во время паузы антиправительственных демонстраций в Таиланде некоторые участники решили расслабиться и покормить голубей.

«Я шчаслівы чалавек...»

*Гутарка пісьменніка **Уладзіміра Сіўчыкава** і Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь **Генрыка Літвіна***

— Велешаноўны спадар амбасадар, ваша прозвішча лашчыць беларускі слых — менавіта літвінамі нярэдка зваліся нашыя продкі ў часы Вялікага княства Літоўскага. Раскажыце, калі ласка, адкуль ідзе ваш род, хто вашы прашчуры і ці ёсць у сямейным архіве генеалагічнае дрэва?

— Мая сям'я — з вёскі, таму сямейныя гісторыі і паданні шукаць нялёгка, бо амаль немагчыма знаходзіць пісьмовыя, дакументальныя крыніцы. А нялёгка па дзвюх прычынах. Першая — гэта, кажучы па-польску, "rodzina chlopska". Куды лягчэй расшукваць гісторыю радзіны людзям, што паходзяць са шляхты. А другая — што падчас Другой сусветнай вайны мая сям'я перажыла шмат цяжкіх момантаў. Спачатку загінуў у нямецкім лагеры мой дзед, потым мой бацька і ягоны старэйшы брат патрапілі ў лагер савецкі, і, шчыра кажучы, мая бабуля тым часам знішчыла нават тое нямногае ў сямейным архіве, што было, — усё згарэла! Ёй падавалася, што паперы могуць быць небяспечнымі, а падрасталі ж яшчэ і малодшыя дзеці...

Няшмат было магчымасцяў, але мы цікавіліся, адкуль такое прозвішча. Калісьці продкі нашы патрапілі ў мясціны непадалёк ад горада Красьністаў, што сёння ў Люблінскім ваяводстве. Але патрапілі, напэўна ж, з Вялікага княства. Верагодна, што адсюль і прозвішча. Аднак далей за прадзеда мы ў сваіх пошуках не заглыбіліся. Менавіта ён, паводле сямейнай легенды, у 60-х гадах пазамінулага стагоддзя патрапіў на гэтае месца, бо трэба было дзесьці далёка хавацца ад пераследу за ўдзел у паўстанні 1863— 1864 гадоў. Як вядома, на тэрыторыі Вялікага Княства вайсковыя дзеянні праходзілі вельмі актыўна. Удзел у іх брала шмат людзей, а таму версія з прадзедам цалкам верагодная. Адначасова мы прапрацоўвалі і іншы варыянт, бо мой прадзед і мой дзед былі уніятамі. Таму мажліва, што яны ўцяклі з беларускай тэрыторыі, бо хацелі застацца уніятамі, а на тэрыторыі так званага Польскага каралеўства ці Прывісленскага краю уніятаў не пераследавалі яшчэ доўгі час. Толькі ў 1898 годзе быў выдадзены царскі дэкрэт, паводле якога уніятаў сталі лічыць праваслаўнымі. Быў вялікі супраціў, вядомыя нават уніяцкія пакутнікі. Майго дзеда пахрысцілі ў лесе. З польскіх тэрыторый, што былі першай спецыялізацыяй была "Гісторыя ўкраінскіх земляў у межах Рэчы Паспалітай у XVII стагоддзі", а тэмай кандыдацкай — "Наплыў польскай шляхты на Украіну паміж Люблінскай уніяй і паўстаннем Б.Хмяльніцкага". Потым займаўся я шляхецкім самакіраваннем і канфесійнымі пытаннямі, гісторыяй Папскай дыпламатыі XVII стагоддзя, а таксама тэорыяй дзяржавы ў другой палове XV — першай палове XVI стагоддзя.

— Неяк у прыватнай размове вы сказалі, што чыталі кнігу нашага даследчыка Генадзя Сагановіча "Невядомая вайна: 1654— 1667". У ёй, на маю думку, разбіваюцца многія стэрэатыпы беларуска-расійскіх дачыненняў, бо ў нас не прынята было прызнаваць, што столькі гадоў маглі ваяваць між сабою народы, якія сёння называюцца братнімі. А між тым Маскоўская дзяржава вынішчыла палову насельніцтва беларускіх земляў, прывяла ў заняпад эканоміку. Ці магчыма, на вашу думку, гістарычная аб'ектыўнасць з улікам нацыянальных інтарэсаў дзяржаў, ці яшчэ ад часоў летапісаў непазбежныя суб'ектыўнасць і выкананне гісторыкамі пэўнага сацыяльнага заказу?

— Думаю, што гэта нават не пытанне "залатой сярэдзіны". Трэба імкнуцца да аб'ектыўнасці, аднак і ўлічваць, што 100-працэнтная аб'ектыўнасць немагчымая хаця б таму, што кожны з гісторыкаў выхаваны ў пэўным асяродку, у пэўных гістарычных, грамадскіх, сямейных умовах. Таму я ніколі не адважыўся б сказаць, што ва ўсіх сваіх работах быў аб'ектыўны. Але стараўся і стараюся, імкнуўся не дазваляць сабе не ўлічваць меркаванні іншых бакоў, калі яны існуюць. Калі працаваў па гісторыі Украіны ў XVII стагоддзі, дык улічваў напрацаванае як украінскай, так і расійскай гістарыяграфіяй, вывучаў работы заходнееўрапейскіх вучоных, а таксама амерыканскіх даследчыкаў, асабліва калі яны маюць беларускія, польскія, украінскія карані. Неверагодна важную ролю заўсёды надаю першакрыніцам. Але і іх стваралі людзі, якія часам суб'ектыўна ацэньвалі падзеі, інфармацыю. Але, паўтаруся, важна імкнуцца да аб'ектыўнасці. І, разам з тым, мне здаецца, што вельмі небяспечная поўная ўпэўненасць некага, што ён цалкам аб'ектыўны. Можа, няма для даследчыка нічога горшага за гэткую ўпэўненасць, бо страчваецца магчымасць самаацэнкі.



— І тады пануе прынцып — ёсць маё меркаванне і няправільныя?

— Так, але ў падобных выпадках я насцярожваюся.

— Маю пэўны сантымент да гістарычнай постаці князя Багуслава Радзівіла як да фактычнага заснавальніка майго роднага горада Жодзіна. Ведаю, што дзякуючы раману "Патоп" Генрыка Сінькевіча і аднайменнаму фільму Ежы Гофмана стаўленне да яго ў Польшчы выразна негатыўнае. Але, пагадзіцеся, фігура гэта складаная і неадназначная.

— Сапраўды, Багуслаў Радзівіл — ахвяра Сінькевіча. Раманіста гэтага я вельмі люблю, але гэта не значыць, што ўсё, што ён напісаў, трэба лічыць выдатным. Сінькевіч вельмі добра ведаў гісторыю, але найперш... выкарыстоўваў яе ў сваёй творчасці. Магу нават расказаць анекдот, які ілюструе, як абыходзіўся ён з крыніцамі. Трэцяя частка трылогіі Сінькевіча — гэта "Пан Валадыеўскі". У галоўнага героя там ёсць маладая жонка па імені Барбара Езёркоўская. У рамане ёсць і расказ пра гэтую Басю. Маўляў, у свой час у яе былі тры прэтэндэнты на руку і сэрца. Расказчык яе гісторыі падае і прозвішчы трох прэтэндэнтаў, якія нібыта загінулі на вайне. Але ў аднаго гісторыка, які іранізаваў з Сінькевіча, я прачытаў, што сапраўдная Бася Езёркоўская была старая баба, якая перажыла сваіх трох мужоў, і толькі чацвёртым быў у яе Валадыеўскі! Я потым праверыў — у сапраўднай Валадыеўскай раней было тры мужы, але і сапраўдныя іх прозвішчы супадалі з прозвішчамі трох прэтэндэнтаў на руку Басі ў Сінькевіча! Што гэта значыць? А тое, што і гэтую гісторыю пісьменнік ведаў, але гуляў, інтэрпрэціраваў факты, рабіў тое, што яму было патрэбна, што было зручна для ягоных раманаў.

Тое самае з Багуславам Радзівілам. У "Патопе" Сінькевічу быў патрэбны цынічны праціўнік галоўнага героя як пэўны кантрапункт.

— Многія літаратары кажуць, што адмоўнага героя лягчэй выпісаць, ён, як правіла, аказваецца больш рэльефным, больш выразным і запамінальным.

— Згодзен, але гэта адзін момант. Другі палягае на тым, што ў рамане таго роду Сінькевічу быў патрэбны добры манарх, dobry krol, і ён зрабіў Яна Казіміра добрым каралём. А на самай справе ўплыў караля на гісторыю тагачаснай Рэчы Паспалітай быў, на мой погляд, абсалютна негатыўны. Ён быў таленавітым палкаводцам, гэта ў яго атрымлівалася някепска, але ўсё астатняе — проста жахліва. Шляхта тады папросту пакінула Яна Казіміра, бо лічыла так: "Кароль мусіць быць спраўным чыноўнікам, а калі не здольны выконваць свае абавязкі як след, дык трэба яго замяніць." Буйныя магнаты лічылі грамадзянамі, гаспадарамі дзяржавы найперш сябе. Яны думалі, што караля можна папросту замяніць, а таму прымалі пратэкцыю караля Густава. Але яны не прынялі да ўвагі, што пад націскам мілітарысцкай Швецыі шмат чаго можа быць страчана назаўсёды. Было зроблена зашмат памылак, перш чым многія зразумелі — трэба вяртацца пад сцягі Яна Казіміра.

(Окончание на 6-й стр.)

Три волны приватизации

Процесс приватизации в Словакии начался задолго до образования Словацкой Республики, еще в 1990 году, как часть реформирования чехословацкой экономики

Этот процесс включал в себя возвращение имущества прежним собственникам, ликвидацию неэффективных государственных предприятий, а также малую и большую приватизацию. Правовой основой процесса большой приватизации в Словакии стал Закон "Об условиях перевода государственной собственности другим лицам" (1991 год), который с момента вступления его в силу изменялся и дополнялся в несколько раз.

Первая волна большой приватизации протекала в 1991—1993 годах и охватила 678 государственных предприятий в различных отраслях промышленности, в сфере услуг, в других областях. Тогда большой эффект принесла чековая приватизация, которая позволила найти решение между объемом имущества, предложенного к приватизации, и объемом имеющихся в распоряжении финансовых средств.

Вторая волна словацкой приватизации 1993—1996 годов позволила приватизировать еще 610 государственных предприятий. Здесь успех достигнут благодаря введению системы кредитования. На сегодняшний день иностранный инвестор имеет полное право приобретения недвижимости, находящейся в частной собственности или в собственности кооперативов. Заметим, что понятие "иностранный инвестор" здесь означает иностранное юридическое лицо или словацкое юридическое лицо, владельцами которого являются иностранцы. Иностранец как физическое лицо имеет полное право арендовать квартиру или дом. Словацкие квартиры отличаются большим разнообразием планировок от самых больших, более семи комнат, до самых маленьких, так называемых гарзонок. Последние представляют собой обычно одну комнату, в углу которой вмонтирована кухонная мебель, ванную и прихожую. Из-за своей дешевизны (4-6 тыс. долларов) гарзонки традиционно считаются временным пристанищем молодых семей.

В Словакии за годы реформ реализованы два этапа приватизации — "большой" и "малой" (в 1993—1994 гг. и 1995—1996 гг.), в результате которых была изменена форма собственности большинства государственных производственных предприятий, а также организаций оптовой и розничной торговли.

С 1999 г. начался новый этап приватизации, распространившейся на почти 40 госпредприятий, включая "естественные монополии", в области газовой промышленности, электроэнергетики, почтовой связи и телекоммуникаций, оборонной промышленности, транспорта, сельского, лесного и водного хозяйства. В 2005-м — первой половине 2006 г. продолжалось углубление процесса внедрения частного капитала, в большой степени иностранного, в экономику Словакии.

В 2006 г. словацкая экономика росла высокими темпами и стала одной из наиболее динамично развивающихся экономик стран ЕС.

Экономические реформы были направлены на создание действенной рыночной экономики и условий для ее включения в западноевропейские экономические структуры.

Андрей РУСАКОВИЧ.

УКРАИНА

О чем звонит колокол?

или Страна вечных выборов

Президент Украины Виктор Ющенко распустил Верховную Раду.

Он обвинил в развале коалиции личные амбиции политиков, намекая на Тимошенко.

Это решение он объяснил тем, что парламент не смог создать новую правительственную коалицию в предусмотренный конституцией срок. Виктор Ющенко подписал указ о роспуске Верховной Рады и проведении досрочных парламентских выборов. Голосование, в соответствии с документом, назначено на 7 декабря 2008 года.

В телевизионном обращении Ющенко объяснил причины своего шага. Он заявил, что "оранжевая коалиция", создавшая правительство во главе с Юлией Тимошенко, прекратила существование из-за личных амбиций и "жажды власти" некоторых политиков.

"В ситуации, когда парламентские силы завели свою работу в глухой тупик, слово должен сказать народ, — сказал президент Украины. — Я призываю к активизации всех украинских избирателей, всех мыслящих людей, всех украинских граждан и всех украинских патриотов — решение, безусловно, за вами. За вами — наивысшая в этом государстве ответственность, поскольку вы выбираете во власть украинских политиков".

Как передает корреспондент Украинской службы Би-Би-Си Светлана Дорош, легитимность указа о роспуске парламента признает и нынешний министр юстиции — представитель пропрезидентского блока "Наша Украина — Народная Самооборона" (НУНС) Николай Онищук, и его предшественник из оппозиционной Партии регионов Александр Лавринович, который сейчас является вице-спикером Рады.

Лидер Партии регионов Виктор Янукович назвал решение президента ударом колокола, "который звонит по нынешней власти", и заявил, что его партия готова к выборам.

Представители Партии регионов в целом одобрили проведение выборов. Депутат от "регионалов" Борис Колесников, которого цитирует "Украинская правда", назвал это оптимальным выходом из политического кризиса. Он пообещал, что его фракция поддержит решения парламента, касающиеся организации выборов.

В Блоке Юлии Тимошенко решение президента назвали антиконституционным. Представители блока считают, что годовой запрет на роспуск парламента (по Конституции Украины Раду VI, сформированную по результатам досрочных выборов, нельзя было распускать в течение года) еще не истек. БЮТ не исключает, что будет обжаловать президентский указ в суде.

"Оранжевая коалиция" в составе блока премьер-министра Юлии Тимошенко (БЮТ) и пропрезидентского блока "Наша Украина — Народная Самооборона" (НУНС) развалилась в сентябре — формально из-за разногласий относительно законов о президентских полномочиях. Эксперты, однако, говорят, что главной причиной развала большинства стал личный конфликт между Ющенко и Тимошенко, не устающих в последнее время выдвигать друг против друга самые смелые обвинения.

Социологические исследования показывают, что идея новых парламентских выборов — уже третьих за последние три года — не пользуется популярностью среди граждан Украины.

Весной прошлого года Ющенко распустил предыдущий состав Верховной Рады, обвинив его в нарушении конституции. Несколько месяцев после этого страна находилась в состоянии жесткого политического противостояния, сопровождавшегося параличом многих институтов власти.

К тому же в 2010 году Украину ожидают очередные президентские выборы, основными игроками на которых эксперты считают Тимошенко и Януковича. Шансы Ющенко на переизбрание президентом пока считаются невысокими.

Многие эксперты уверяют, что очередные внеочередные выборы не слишком изменят соотношение сил в украинском парламенте, и страна опять окажется в ситуации политической неопределенности.

Алесь ДРАБЧУК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
16 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

«Я шчаслівы чалавек...»

(Окончание. Начало на 5-й стр.)

Князь Багуслаў Радзівіл — вельмі яркая асоба, чалавек, у якога надзвычай насычанае жыццё, які з'яўляецца героем многіх гераічных падзей, але і афер, авантур у Францыі, Нідэрландах, Англіі... Ён быў вельмі мужны, выдатны ваяр, некалькі разоў ахвяраваў немалыя грошы на абарону Вялікага княства і Рэчы Паспалітай, быў шчодрым мецэнатам. Таму многае ў гэтай постаці неадназначна, але, калі верыць Сінькевічу, Багуслаў, акрамя ўсяго, яшчэ і злы дух Януша Радзівіла, а гэта абсалютная няпраўда. Таму трэба чытаць гістарычныя першакрыніцы, а ў тым ліку і "Аўтабіяграфію" Багуслава Радзівіла. Дарэчы, перакладзена яна на беларускую мову?

— "Аўтабіяграфія" рыхтуецца цяпер да выдання ў выдавецтве "Радыёла-плюс" у перакладзе з польскай мовы Анатоля Бутэвіча.

— Выдатна, бо гэта вельмі цікавая крыніца! Але ёсць і іншыя дакументы таго перыяду. Як і князь Багуслаў Радзівіл, большасць шляхты зрабіла кароткачасовы выбар на карысць шведаў, але рабіць яго галоўным віноўнікам таго, што тады адбывалася, аніяк не выпадае. Тым больш што да вайсковых дзеянняў далучыўся электар Брандэнбургскі, які быў блізкім сваяком князя Багуслава...

— Вы маеце на ўвазе курфюрста Фрыдрыха Вільгельма, кузена па матчынай лініі?

— Так. Багуслаў быў на той перыяд хутчэй з ім, чым са шведамі. Але для гісторыкаў, а таксама для Сінькевіча было важна, што князь, можна сказаць, супрацоўнічаў з дзяржавай, якая пазней стала атаясамлівацца з Прусіяй, якая ў сваю чаргу адыграла вельмі негатыўную ролю ў лёсе Рэчы Паспалітай. Хоць і цяжка лічыць вінаватым у падрыхтоўцы падзелаў Рэчы Паспалітай Фрыдрыха Вільгельма, у нас у Польшчы негатыўнае адценне — як бы мы ні імкнуліся да аб'ектыўнасці — заўсёды будзе класціся на палітыкаў, што супрацоўнічалі з Прусіяй. У нас заўсёды застаецца пад увагаю, да чаго гэта прывяло. Але як гісторык скажу: каб належным чынам ацэньваць постаць князя Багуслава Радзівіла, трэба ўлічваць умовы той эпохі.

— Давайце паспрабуем вярнуцца ў сучаснасць. Раскажыце, калі ласка, як вы патрапілі на дыпламатычную службу і ці быў у вас выбар краіны? Вы кажаце, што, мажліва, маеце беларускія карані, а як навуковец займаліся польска-ўкраінскімі сувязямі.

— На пачатку 90-х гадоў у нашым Міністэрстве замежных спраў шукалі людзей, а ў тым ліку і навукоўцаў, якія маглі б займацца пытаннямі суседніх краін. У Мінск тады патрапіла спадарыня прафесар Эльжбета Смулкова, а некалькі чалавек, якія займаліся ўкраіністыкай, пайшлі на адпаведны напрамак. Украінскую мову я збольшага ведаў, а спецыялістаў па Украіне ў Польшчы было нямнога. Тады перада мною стаяла некалькі цяжкіх жыццёвых пытанняў, а прапанова паехаць ва Украіну амаль што ўсе з іх вырашала. У сярэдзіне 1991 года я выехаў у Львоў як шэф консульскага агенцтва, якое ператварылася потым у генкансульства. Потым быў у МЗС, чатыры гады прапрацаваў у Рыме, адтуль пераехаў у Маскву, пасля зноў два гады ў Варшаве, а цяпер вось у Мінску. Як бачыце, мае выезды пераважна супадаюць з навуковымі інтарэсамі.

— А ці задавальняюць вас умовы працы ў беларускай сталіцы і ці можна параўнаць іх з умовамі працы вашага беларускага калегі ў Варшаве?

— Цяперашнія ўмовы працы польскіх дыпламатаў далёкія ад таго, што людзі маюць у галовах з часоў Польскай Народнай Рэспублікі, калі выезд у заходнія краіны з атрыманнем выплат у доларах лічыўся немаведама чым. Сёння гэта нармальная работа, але маладыя людзі, якія прыходзяць у дыпламатыю, маглі б атрымліваць куды большыя сродкі ў эканоміцы, у бізнесе. Новых людзей прымаць нам нялёгка, бо шмат патрабуем, а адносна нямнога даём. Але разам з тым някепска, асабліва калі гаварыць пра ўзровень шэфаў прадстаўніцтваў. Як чалавек з маёй прафесійнай падрыхтоўкай я павінен быць задаволены. А калі параўноўваць варшаўскія і мясцовыя ўмовы, дык беларуская амбасада ў Варшаве знаходзіцца, можа, і не так блізка ад цэнтра горада, затое будынак вельмі добры, падрыхтаваны менавіта пад пасольства. Мой беларускі калега ў гэтым сэнсе напярэдзе. Але будзем імкнуцца да таго, каб палепшыць свае ўмовы. Гэта найперш пытанне часу і дамоўленасцяў з беларускім бокам, хаця такі сусед Беларусі, як Польшча, мусіў бы мець такі будынак, які маюць літоўцы або, скажам, украінцы. Пабудаваць новае пасольства — наша праграма. Трэба дамаўляцца наконт зямельнага ўчастка і рухацца далей.

— Давайце крыху зменім накірунак размовы. Ці не маглі б вы расказаць пра свае ўпадабанні ў польскім і ў сусьветным мастацтве і літаратуры?

— Многае змянілася пасля таго, як я пачаў працаваць у МЗС, таму што павінен быў павысіць інтэлектуальную актыўнасць. Не хацеў пакідаць займацца гісторыяй, а таму зрабіў яе сваім хобі. Але цяпер стала значна прасцей — шмат што можна ўбачыць праз internet. Да таго ж маю немалую бібліятэку і архіў, якія паспеў сабраць ад пачатку сваёй працы. Многае магу рабіць, нават калі я далёка ад замежных архіваў і бібліятэк, але заўсёды з цеплынёй згадваю мажлівасці, якія меў у свой час у Рыме.

Але стараюся гэтаксама цікавіцца літаратурай, музыкай, гісторыяй культуры краіны, у якой працую. У Італію я патрапіў упершыню ў 31 год. Тады я падумаў: "Якое гэта было жахлівае абмежаванне для нас, для людзей, якія жылі ў так званым сацыялістычным лагеры! Мы не маглі выхоўвацца ў непасрэдным кантакце з агульнаеўрапейскай культурнай спадчынай. Які, да прыкладу, мастацтвазнавец, што не бачыў на свае вочы "П'ету" Мікеланджэла Буанароці?!"

У сувязі з гэтым шмат займаюся знаёмствам з краінай, дзе працую, — чытаю, гляджу кіно, шмат падарожнічаю. І ўсё ж мушу прызнацца, што асноўны багаж сусветнай літаратуры набраў у 15— 28-гадовым узросце, а потым давялося аддаваць перавагу навуковай літаратуры. У апошнія гады моцнае ўражанне было ад "Умовы" польскага аўтара Эўстахія Рылыскага. Думаю, была б яна цікавай і беларускаму чытачу. Гэта гісторыя салдата Напалеонаўскага войска, які паходзіць з сям'і, што жыла на Наваградчыне.

Але многае цяпер магу адкласці, калі не падабаецца, пасля 10— 20 старонак. Да таго ж з узростам чалавек, мне здаецца, усё больш увагі надае мемуарам, дзённікам, дакументальным рэчам.

— Пра гэта сведчаць і рэйтынгі польскіх бестселераў за апошнія гады. Летась, да прыкладу, найлепш прадаваліся ў Польшчы не дэтэктывы, а мемуары, рэлігійныя рэфлексіі, інтэлектуальная літаратура, літаратура факту і творы Рышарда Капусцінскага, які, дарэчы, нарадзіўся ў Пінску і толькі падчас вайны выехаў у Польшчу, дзе стаў славутым публіцыстам і рэпартажыстам.

— З узростам усё цяжэй прымаць інтэрпрэтацыі іншых людзей, куды цікавей збіраць факты і ацэньваць іх самому. Можа, таму апошнімі тыднямі намагаюся канцэнтравацца на ўспамінах людзей, што жылі на тэрыторыі Беларусі. Мне гэта вельмі цікава.

— А каго з беларускіх творцаў — пісьменнікаў, мастакоў, музыкаў, кінематаграфістаў, дзеячаў тэатра — ведаеце і цэніце, з кім паспелі пазнаёміцца?

— У маёй маладосці не было мажлівасці глыбока пазнаёміцца з беларускай культурай, але помню, што чытаў аповесці Васіля Быкава ў канцы 70-х гадоў. Гэта была кніга выдавецтва PIW (Polski Instytut Wydawniczy). Пазней я вяртаўся да ягонай творчасці, хаця ў школе нас не вучылі, што ёсць і беларуская літаратура. Пасля знаёміўся з такімі класікамі, як Янка Купала і Якуб Колас, але ў нас, на жаль, не так шмат, як хацелася б, перакладаў, а ў тым ліку і анталогій...

— Тады трэба разам парадавацца, бо апошнім часам сітуацыя значна палепшылася. За апошнія два-тры гады ў перакладах на польскую выйшлі "Цынкавыя хлопчыкі" Святланы Алексіевіч, "Калі рукаюцца душы" Рыгора Барадуліна і Васіля Быкава, "Каханак яе Вялікасці" Уладзіміра Арлова, "Свята Новага году" Андрэя Хадановіча, "Лясная дарога. Версэты" Алеся Разанава, "Дыялогі з Богам" Валянціна Акудовіча, анталогія беларускай паэзіі XV— XX стагоддзяў "Чала я не хіліў прад сілай", анталогія маладой беларускай паэзіі "Пупок неба" і іншыя.

— Што ж, апошняе з таго, што я чытаў, і праўда, выходзіла пры спрыянні Калегіума Усходняй Еўропы. Польскія аматары паэзіі змаглі пазнаёміцца з творчасцю Арлова і Разанава, а на кнігу Андрэя Хадановіча вельмі цёпла адгукнуўся Павел Хюле.

З мастакоў заўважыў Аляксея Марачкіна, а з рэжысёраў ведаю Віктара Дашука. Бо мы з ім сустракаліся і тое-сёе я паспеў паглядзець.

Дастаткова лёгка было мне зразумець значнасць беларускага року: "N.R.M."і іншыя гурты ў нас вядомыя. Да таго ж я з пакалення, якое вырастала на року. Таму тое, што чую з калекцыі майго старэйшага сына, не з'яўляецца мне сюрпрызам.

— Шмат стагоддзяў гістарычныя лёсы беларусаў і палякаў цесна знітаваныя. Нават сімвалы нацыянальных трагедый — Хатынь і Катынь — гучаць амаль неадрозна...

— Мы сапраўды звязаны вельмі цесна. Лёс Беларусі падчас вайны асабліва трагічны. А таму гаварыць пра гэта рацыянальна вельмі цяжка, бо тут найперш задзейнічаны эмоцыі. Што тычыць падабенства назваў Катынь і Хатынь, дык баюся, што гэта невыпадкова. Мясцінаў, звязаных з трагічнымі падзеямі, вельмі многа. Не выключаю, што Хатынь як мемарыял была выбрана савецкімі прапагандыстамі знарок.

— Каб заблытаць, змяшаць з Катынню?

— Не скажу, што гэта маё сцвярджэнне, але з такім меркаваннем сустракаўся я неаднаразова. Значэнне гэтых месцаў кардынальна рознае, сувязь паміж імі толькі ў трагічнасці падзей. І гісторыя гэтых мясцін розная. Палякам вельмі важна і тое, што гісторыя Катыні — гэта гісторыя хлусні! Надзвычай важна не толькі тое, што закатаваныя там тысячы людзей, але і тое, што ўся моц прапаганды была сканцэнтравана на тым, каб не дапусціць праўдзівага слова пра тое, што там адбылося! Вялізныя намаганні былі пакладзены на тое, каб прымусіць саміх палякаў забыць або лжыва сведчыць пра Катынь.

— І не толькі палякаў! У верасні 1939 года на тэрыторыі Польшчы Чырвонай Арміяй былі захопленыя каля 240 тысяч палонных, а ў красавіку—маі 1940 года каля 22 тысяч польскіх грамадзян - палякаў, беларусаў, габрэяў і ўкраінцаў, якіх утрымлівалі ў розных турмах і лагерах, расстралялі пад Катынню, як расстрэльвалі іх пад Курапатамі і ў іншых месцах катаванняў. Па-беларуску словы "Катынь" і "катаванні" гучаць як аднакарэнныя, а таму асабліва злавесна. А між тым расійская вайсковая пракуратура і сёння адмаўляецца прадаставіць Хамоўніцкаму суду ў Маскве матэрыялы справы па Катыні, сцвярджае, што большасць з 183 (!) тамоў мае грыф "Абсалютна сакрэтна". Але гістарычная памяць асэнсоўваецца і на мастацкім узроўні. Пра Катынь у аднайменным кінафільме Анджэя Вайды гаворыцца вельмі выразна і балюча.

— Прапагандысцкая хлусня пра Катынь і пра Курапаты — гэта здзек з гістарычнай памяці народаў. І палякам, і беларусам папросту загадвалі забыць пра гэта. А я помню, што ў школе нават само слова "Катынь" было забаронена.

— Крыху, можа, расплывістае пытанне. Ці можаце параўнаць жыццё людзей у Польшчы і на Беларусі?

— Палякі ўсё ж не былі пад такім непасрэдным уплывам і ціскам Савецкага Саюза і ўсяго, звязанага з яго існаваннем, з трагічным уплывам на эканоміку і менталітэт. Мы шмат страцілі ў параўнанні з заходнееўрапейцамі. У той час, калі яны развівалі культ працы, у нас лічылася, што не варта перапрацоўваць, бо ўсё ідзе на карысць дзяржавы, а не асобы. На жаль, мы адставалі ад Захаду, але менш за народы, што жылі ў межах СССР.

— А ці падтрымліваеце вы ідэю зніжэння кошту шэнгенскай візы для беларусаў? Нярэдка можна пачуць меркаванне, што Захад ахвотна гаворыць пра дапамогу беларусам, а тым часам шараговаму грамадзяніну нялёгка патрапіць за межы краіны.

— Гэта не так, што Еўропа адкрытая для Беларусі і разам з тым выстаўляе высокі кошт візаў. Гэта дзве розныя рэчы, два розныя парадкі.

Еўропа хоча быць адкрытай, Польшча хоча быць адкрытай. Наш вопыт паказвае, што ад прыездаў беларусаў, украінцаў, расіян мы маем найперш прыбыткі. Калі паставіць штучны бар'ер, ён не дазволіць прыехаць звычайным людзям, а тыя, што нясуць бяспеку, здолеюць атрымаць візы і заплаціць за іх. У нас, палякаў, былі вельмі танныя візы для беларусаў, бясплатныя для ўкраінцаў і жыхароў Калінінградскай вобласці, і пра гэты вопыт мы гаворым. Але зніжэнне кошту візаў — гэта іншы парадак. Трэба дамаўляцца не з грамадствам, а з урадам. Ёсць праблема і ў тым, як тэхнічна апрацаваць гэтае пытанне ў межах цэлай сістэмы.

Польшча была практычна адкрытай на Еўрасаюз з пачатку 90-х: палякі без праблем ездзілі па ўсёй Еўропе. Аднак, калі мы ўвайшлі ў Шэнгенскую зону? Толькі сёлета! Вось які доўгі перыяд ад пачування сябе ў Еўропе да рэальнага ўваходу ў Еўрасаюз 1 мая 2004 года і ў Шэнгенскую зону 1 студзеня 2008 года.

— Як вы ацэньваеце працу тэлекампаніі "Белсат"? У нас на Беларусі, бывае, раздаюцца раздражнёныя і крытычныя галасы: маўляў, і сігнал цяжка прымаць, і спадарожнік не той, і многія творчыя сілы адцягнутыя ў Польшчу, а вынікі, калі параўнаць фінансавыя і інтэлектуальныя выдаткі з уплывам на беларускую супольнасць, абсалютна неадпаведныя.

— "Белсат" — ініцыятыва канкрэтных людзей і канкрэтнага асяродку. Ініцыятыва тая развіваецца, знайшла падтрымку дзяржавы. Ідзе супрацоўніцтва і з іншымі краінамі, якія падтрымліваюць гэты праект. Насамрэч гэта грамадская ініцыятыва, знітаваная з людзьмі, якія зацікаўленыя гэтым праектам, а я не магу ацэньваць грамадскую ініцыятыву. Пра эфектыўнасць тэлеканала трэба было б запытацца ў гледачоў, у тых, да каго ён апелюе.

— Не магу назвацца актыўным спажыўцом прадукту "Белсата", але за стварэнне фільмаў кшталту "Слуцкі збройны чын" пры ўсіх маіх прэтэнзіях і заўвагах здымаю, як кажуць, капялюш.

— Я сустракаю крытычныя ацэнкі з боку прадстаўнікоў улады і дастаткова пазітыўныя ацэнкі з боку прадстаўнікоў апазіцыі. Чуў таксама, што неўзабаве праграмы будуць трансліравацца праз іншы спадарожнік, а з цягам часу і ўсё іншае ўладкуецца.

— Вось вы згадалі крытыку прадстаўнікоў улады. А чым, на вашу думку, можна патлумачыць нервовую рэакцыю многіх афіцыйных асоб на ўвядзенне "карты паляка", на якую, паводле некаторых экспертаў, можа прэтэндаваць чвэрць мільёна беларускіх грамадзян?

— Не бачу сэнсу шукаць прычын, акрамя тых, якія мы пачулі ў заявах беларускага МЗС, а потым і са слоў першай асобы дзяржавы.

Ну добра, прымаем пэўную занепакоенасць беларускага боку: маўляў, пад сумненне ставіцца тэрытарыяльная цэласнасць Беларусі. Але няма ніякай нагоды бачыць сітуацыю ў падобным ракурсе. Гэта проста кампенсацыя, прычым хутчэй маральная, палякаў, якія жывуць у Польшчы, палякам, якіх Польшча пакінула без дапамогі, без кантактаў. Калі краіна стала незалежнаю, аднавіліся і размовы, што трэба неяк вырашаць гэтае пытанне, а ўрэшце выкрышталізавалася і думка пра закон, які ўрэгуляваў бы дапамогу палякам па-за межамі Польшчы. З боку беларускіх уладаў ёсць сумненні і занепакоенасць, як мы будзем уводзіць "карту паляка". Мы стараемся ўлічваць гэта ў сваёй працы, але калі ўжо прыняты закон, дык консулы і іншыя супрацоўнікі мусяць яго рэалізоўваць. Нам бачыцца, што аніякай пагрозы "карта паляка" не нясе. Палякі на Беларусі — гэта людзі, вельмі цесна звязаныя з краінай, даволі многа змешаных беларуска-польскіх шлюбаў. Няма супрацьстаяння ці супрацьпастаўлення "беларус— паляк", тым больш што можна помніць пра польскія карані, але лічыць сябе беларусам. Я не бачу праблемы для Беларусі — як для грамадства, так і для дзяржавы, але нельга не заўважаць негатыўнага ўспрыняцця "карты паляка" ўладамі. Мы стараемся весці дыялог, тлумачыць сваю пазіцыю, даводзіць, што бяспекі няма.

— Дзякуй! Далей будзе разгорнутае пытанне. У першым туры беларускай агульнанацыянальнай дыктоўкі, прысвечанай 90-м угодкам Беларускай Народнай Рэспублікі, поруч з амбасадарамі Украіны, Вялікай Брытаніі, Славаччыны, Чэхіі, Злучаных Штатаў Амерыкі ўзяла ўдзел прэс-сакратар вашай амбасады Моніка Садкоўска. Але потым статус удзелу быў павышаны: праз некалькі дзён вы асабіста напісалі дыктоўку паводле прадмовы Францішка Багушэвіча да паэтычнага зборніка "Дудка беларуская", які, дарэчы, быў надрукаваны лацініцай у 1891 годзе ў Кракаве і перавозіўся на Беларусь кніганошаю і... будучым начальнікам Польскай дзяржавы Язэпам Пілсудскім. Гэта быў публічны акт падтрымкі беларускай мовы ці нешта большае? І ці мажлівая ў перспектыве акцыя "Еўрадыктоўка", дыктоўка ад мора да мора, калі адначасова селі б пісаць дыктоўку беларусы, літоўцы, палякі і ўкраінцы?

— Зразумела, гэта быў акт падтрымкі беларускай мовы. Мне здаецца цалкам заканамерным, што ў краіне прабывання пасол бярэ ўдзел у мерапрыемстве, якое ўшаноўвае і падтрымлівае дзяржаўную мову. Тым больш, што гэта ў чымсьці польская ідэя. І мне падабаецца ініцыятыва агульнай... ці як вы сказалі?

— Балтыйска-чарнаморскай ці нават еўрадыктоўкі!

— Усё, дзякуючы чаму мы ўспамінаем сувязі, што вынікаюць з часоў першай Рэчы Паспалітай, мне вельмі даспадобы. Перш за ўсё як гісторыку і энтузіясту той дзяржавы. Зразумела, быў там і шэраг механізмаў, якія не дужа хораша працавалі, але гэта была вельмі цікавая дзяржава, дзе суб'ектамі былі людзі на месцах, дзе надзвычай важным было самакіраванне. Можа, у гісторыі Еўропы гэта была самая дэмакратычная дзяржава, а Канстытуцыя 3 мая адкрывала шлях да сапраўднай грамадскай супольнасці. Гэта наша сумесная спадчына, вельмі важная сёння для ўсёй Еўропы, а таму паўтару: усё, дзякуючы чаму мы будзем успамінаць і расказваць іншым пра Вялікае княства і першую Рэч Паспалітую, вельмі важнае, вельмі карыснае і вельмі добрае. Я буду ўсё гэта падтрымліваць, а ідэю адначаснай дыктоўкі чатырох нацый лічу вельмі перспектыўнай і прадуктыўнай.

— Я вельмі рады, што вы згадалі Канстытуцыю 3 мая. На пачатку мая адны, як вядома, адзначаюць Дзень вясны і працы, а другія ўшаноўваюць Канстытуцыю 3 мая 1791 года, а таксама пашырэнне межаў Еўрасаюза і дзень вольнага друку. Як вы лічыце, ці хутка беларусы далучацца да ліку іншых?

— Мне, па шчырасці, не падабаюцца дыскусіі наконт таго, хто з'яўляецца еўрапейцам, а хто не. Гэта як з народамі — палякам ёсць той, хто пачуваецца палякам, еўрапейцам ёсць той, хто пачуваецца еўрапейцам. Ніхто не ў праве казаць мне, ці еўрапеец я. Гэта ведаю я сам! Тое самае можа казаць кожны беларус, які пачуваецца еўрапейцам.

З пункту гледжання гісторыі цывілізацыі Беларусь з'яўляецца часткаю еўрапейскай культурнай спадчыны. Цяжэй сёння казаць пра палітычныя структуры. Усе мы ведаем, што сёння ўлады Беларусі рэалізуюць, так сказаць, трэці шлях. Польшча прапаноўвае гэтай частцы Еўропы іншы шлях. Ідэальнага выбару няма ніколі, але найбольш эфектыўным нам бачыцца (і ў нас ужо ёсць пэўны вопыт) выбар, знітаваны з Еўрасаюзам. Гэта дастаткова хуткая мадэрнізацыя і палітычнай сістэмы, і эканомікі, і тэхналогій. І мы прапаноўваем гэткі выбар іншым. Але кожны вольны выбіраць што захоча.

— Як вы ацэньваеце 28-моўны "Беларуска-лацінска-еўрапейскі слоўнік" Лявона Баршчэўскага, што выйшаў сёлета ў Вроцлаве? Ці можна сказаць, што гэта адзін з прыкладаў беларуска-еўрапейскай інтэграцыі?

— Гэта вельмі цікавае выданне! У мяне ёсць некалькі асобнікаў, і гасцям з іншых краін, якія прыходзяць у пасольства, я перадаю гэты слоўнік як падарунак. Можа нават, не такі ён важны як практычны падарунак, але вельмі значны як навуковы...

— І нават як пэўны сімвал таго, што беларусы здольныя рабіць рэчы, якія можна падарыць любому адукаванаму еўрапейцу.

— Так, гэта і сімвал, і свайго роду сімпатычны сувенір. Прычым сама ідэя шматмоўнага слоўніка вельмі арыгінальная, беларуская.

— На Беларусі стаяць чатыры помнікі Адаму Міцкевічу. Як вы ставіцеся да ідэі ўсталяваць у Варшаве помнікі Янку Купалу і Якубу Коласу?

— Пазітыўна. Але ўсё ж не раўназначныя велічыні — помнік Міцкевічу ў Беларусі і помнік Коласу ў Варшаве...

— Беларусы маюць ужо прыкры вопыт — мы паставілі помнік Аляксандру Пушкіну ў Мінску, а помнік Купалу ў Маскве дагэтуль не адкрыты, хоць і была ўзаемадамоўленасць з расійскім бокам.

— А як звязаны з Беларуссю Пушкін?

— Пачаць хаця б з таго, што нянька Пушкіна Арына Радзівонаўна была беларускаю і выхоўвала будучага паэта на беларускіх казках...

— Але калі я спытаўся б у вас, як звязаны з Беларуссю Адам Міцкевіч, дык вы намнога больш маглі б гаварыць пра гэта?

— Канечне!

— Міцкевіч для Беларусі — не толькі польскі паэт, а нашмат болей. Таму механічны абмен я не ўводзіў бы. Купала для палякаў таксама вельмі важная постаць. Ён надаваў шмат увагі перакладам з польскай паэзіі, і нават за адно толькі гэта мы павінны паставіць яму помнік.

— Прабачце, але заўважу тут, што і пачынаў свой творчы шлях Янка Купала як польскамоўны паэт: яго раннія вершы былі напісаны на польскай мове!

— Я, прызнацца, пра гэта не ведаў...

— Даследчык і перакладчык Уладзімір Мархель з год таму эпаціраваў публіку, калі ў інтэрв'ю Радыё Свабода заявіў, што напісаў за Янку Купалу дваццаць чатыры, калі не памыляюся, вершы.

— ???

— Ён пераклаў тыя вершы (праўда, аўтарства аднаго з іх досыць спрэчнае) маладога Купалы з польскай на беларускую мову. А Якуб Колас, як вядома, пачынаў пісаць на рускай мове.

— Я не спецыяліст па Коласу і не памятаю пра ягоныя дачыненні з польскімі пытаннямі. Разам з тым думаю так: механічная ўзаемнасць — не заўсёды найлепшы шлях. Я б з задавальненнем паспрыяў усталяванню помніка Купалу ў Варшаве. Той, хто ведае свайго суседа, ставіцца да яго прыязна. Мы баімся таго, чаго не ведаем. Таму нам абсалютна неабходна пашыраць веды пра беларусаў, расіян, украінцаў, немцаў, чэхаў, славакаў, літоўцаў.

— Спадар амбасадар, я ведаю, што вы захапляецеся фотамастацтвам. Ці можна чакаць у перспектыве — блізкай ці далёкай — вашай персанальнай выставы ў Мінску?

— У мяне, хутчэй, не сталыя, а спарадычныя перыяды заняткаў фатаграфіяй. І найчасцей яны звязаны з выездамі ў іншыя краіны. Так было ва Украіне, у Італіі... На пачатку 90-х на Украіне я даязджаў да некаторых аб'ектаў і мясцін, можа нават, першы. На Беларусь я прыехаў у верасні, было шмат арганізацыйных турбот, але з вясны пачалі выязджаць у рэгіёны. Спадзяюся, што і фатаграфічны эфект будзе. Але да выставы яшчэ далёка.

— Пэўная асоба ў нас не раз публічна самавызначалася як "праваслаўны атэіст". А ці можна пачуць пра вашы стасункі з інстытутам царквы, а дакладней, з касцёлам?

— Гэта вельмі інтымная частка жыцця. Магу толькі сказаць, што я католік і з першых дзён сваіх жыў у каталіцкай сям'і.

— Адзін з нашых знаных пісьменнікаў параўнаў сваё жыццё з келіхам добрага чырвонага віна. З чым параўналі б сваё жыццё вы?

— Я крыху знаюся на італьянскіх вінах, але не рызыкнуў бы назвацца тонкім дэгустатарам. Здаецца, не маю і такога таленту, каб рабіць з жыцця літаратуру. Магу толькі сказаць, што адчуваю сябе вельмі шчаслівым чалавекам. Як гісторык бачу, што мяне напаткала штосьці неверагодна цудоўнае. На свае вочы я бачыў, як змяніўся свет. Можа, не свет, але Еўропа, прастора, у якой я жыў, дакладна змянілася. Лічу гэта вялікім шчасцем. Я пачынаў вучыцца ва універсітэце ў 1977 годзе і, шчыра кажучы, не меў надзеі, што буду колісь жыць у іншай, несацыялістычнай прасторы. Мне хацелася стаць гісторыкам, каб... збегчы. Збегчы ў іншы свет, у свет гісторыі, хоць і ведаў, што гэта будзе ўнутраная эміграцыя. Але потым адбыўся цуд — свет змяніўся! А да цуду гэтага быў прыналежны і чалавек, які ўсім палякам неверагодна важны — Ян Павел II. Я быў на набажэнстве ў Варшаве ў 1979 годзе, калі Папа сказаў прарочыя словы пра тое, што зменіцца аблічча гэтай зямлі ("Niech zstapi Duch Twoj i odmieni oblicze ziemi, Tej ziemi"). Я бачыў сваімі вачыма, як мянялася аблічча не толькі Польшчы, але і ўсёй Еўропы. Юнаком я думаў, што пражыву ў няволі, а аказалася, што я вольны чалавек. Нам была дадзена мажлівасць выбіраць, і гэта штосьці неверагоднае. І таму, калі думаю пра сваё жыццё, думаю, што я шчаслівы чалавек: мне сустрэлася штосьці вельмі важнае і я змог зразумець — адбылося неверагодна важнае. Чаго ж яшчэ хацець?

— Вялікі дзякуй, спадар амбасадар, за шчырую і змястоўную гутарку найперш ад імя чытачоў "Народнай волі"!

Поўны тэкст гутаркі можна прачытаць у часопісе "Дзеяслоў" №4 (35)-2008.

СІТУАЦЫЯ

Вернікі працягваюць галадоўку-пост

63 чалавекі з Мінска і гарадскога пасёлка Івянец Валожынскага раёна Мінскай вобласці працягваюць бестэрміновы пост за вяртанне вернікам будынкаў Мінскага кляштара бернардзінцаў з касцёлам — помніка архітэктуры барока XVII стагоддзя, паведаміла БелаПАН член мінскай рымска-каталіцкай абшчыны Святога Язэпа Івона Мацукевіч.

Паводле яе слоў, у распачатым 30 жніўня гэтага года посце бяруць удзел 56 жанчын і сем мужчын рознага ўзросту, узроўню адукацыі і прафесій. Сярод іх — 60 вернікаў сталічнай рымска-каталіцкай абшчыны Святога Язэпа і трое католікаў з Івянца. Некаторыя з удзельнікаў посту абмежавалі сябе адной вадой, хтосьці ўжывае хлеб і ваду. Кожны ўдзельнік акцыі абраў для сябе пэўныя дні посту на працягу тыдня.

Як зазначыла І.Мацукевіч, усе вернікі не адчуваюць праблем са здароўем.

Нагадаем, што летась пад зваротам да кіраўніка дзяржавы за вяртанне кляштара вернікам было сабрана каля 30 тысяч подпісаў. Збор подпісаў пачаўся пасля таго, як стала вядома аб планах Мінгарвыканкама перадаць будынкі святыні інвестарам для іх прыстасавання пад гасцінічны комплекс і аб'екты гандлёва-бытавога прызначэння. Кляштар быў канфіскаваны ў 1864 годзе ўладамі Расійскай імперыі пасля ўдушэння нацыянальна-вызваленчага паўстання супраць рускага царызму пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. На працягу наступных 144 гадоў дзяржава бясплатна карысталася комплексам, пабудаваным на сродкі вернікаў. З кляштара выселены службы ваеннай камендатуры і пракуратуры. Аднак у будынку касцёла да гэтага часу размяшчаюцца Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі і Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. З 19 сакавіка 2005 года члены абшчыны Святога Язэпа праводзяць кожны вечар каля будынка касцёла набажэнствы за вяртанне святыні вернікам.

Марат ГАРАВЫ.

Толькі палова дачнікаў захавае свае дзялкі

8 кастрычніка скончыўся тэрмін падачы дакументаў для рэгістрацыі дачных участкаў.

Паводле Указа Аляксандра Лукашэнкі №50 ад 28 студзеня 2008 года "Аб мерах па ўпарадкаванні дзейнасці садаводніцкіх таварыстваў" дачнікі-адзіночкі і дачныя кааператывы павінны былі зарэгістраваць сваё права на выкарыстанне зямельнага ўчастка. У адваротным выпадку дачу ў такіх карыстальнікаў могуць забраць.

Па стане на 7 кастрычніка сябрамі садаводніцкіх таварыстваў зарэгістравана 233.294 зямельныя ўчасткі, або толькі каля 45% ад іх агульнай колькасці (усяго ж у краіне 521.520 участкаў), паведамляе "Ежедневник".

288.226 зямельных участкаў (а гэта каля 55,2% ад іх агульнай колькасці), якімі карысталіся сябры садовых таварыстваў, так і не былі зарэгістраваны. Яшчэ 13.858 (каля 2,7%) заяў на рэгістрацыю прыняты, але яшчэ не апрацаваны. Калі яны будуць задаволеныя, то ўсяго па краіне будзе зарэгістравана каля 47,7% участкаў.

«Доктар Дызель»: беларуская версія

Піваварная кампанія "Сябар" (Бабруйск), якая ўваходзіць у міжнародную групу кампаній Heineken, пачала ліцэнзійную вытворчасць і продаж у Беларусі піва "Доктар Дызель". Раней гэтая марка піва вырабляласа выключна ў Расіі.

Прадстаўнікі канцэрна Heineken заяўляюць: *"Мясцовая вытворчасць папулярнай піўной маркі будзе спрыяць замяшчэнню яе імпарту, удзельная вага якога ў агульным аб'ёме піва, што ўвозіцца ў Беларусь, у апошнія шэсць месяцаў складае 4,33%. [...] Маркетолагі нашага прадпрыемства разлічваюць, што вырабленае па ліцэнзіі піва "Доктар Дызель" не толькі зойме месца ўвазнога, але і перавысіць яго аб'ёмы".*

Дырэктар па маркетынгу кампаніі "Heineken у Беларусі" Наталля Літвінава так каментуе запуск вытворчасці піва "Доктар Дызель": *"Вельмі важна, што брэнд, які раней у вялікіх аб'ёмах імпартаваўся, мы запускаем у вытворчасць у ліцэнзійным фармаце. Зараз піва, якое любяць і ведаюць у Беларусі, будзе вырабляцца на бабруйскім тэхнічна добра абсталяваным бровары".*

КАМЕНТАРЫЙ:

Ігар ЕМЕЛЬЯНОВІЧ,

журналіст, аўтар радыёпраграмы "З півам па жыцці":

— Я сапраўды ведаю, што 9 кастрычніка без лішняй агалоскі была выпушчаная першая — выпрабавальная — партыя піва: 1000 дэкалітраў. Але мне пакуль складана сказаць, наколькі гэты праект нагогул перспектыўны. Вядома, што рэалізуецца ён у рамках праграмы імпартазамяшчэння. Гэта значыць пастаўлена задача: не вазіць піва з Калінінграда, з Піцера, а вырабляць самім.

У Бабруйску цяпер усталявана самае сучаснае ў Беларусі броварнае абсталяванне, вядзецца якасная аачыстка вады. Так што вытрымліваць тэхналагічныя патрабаванні цалкам магчыма. Якасць беларускага ячменю сёлета нармальная, хмелю — таксама. Зразумела, у Бабруйску не атрымаецца зварыць такое ж піва, якое вязуць да нас з Расіі з заводаў Heineken. Але, думаю, якасць нашага прадукту пацягне на "чатыры з плюсам" па пяцібальнай шкале.

Віктар ДЗЯМІДАЎ.

ЗДАРЭННЕ

Будзе час падумаць

Да 5 гадоў пазбаўлення волі асуджаны 24-гадовы жыхар Багушэўска, які сярод ночы збіў некалькіх супрацоўнікаў мясцовай бальніцы ды напалохаў пацыентаў.

П'яны мужчына разбіў твар і пайшоў да медыкаў па дапамогу. Аднак замест таго каб атрымаць яе, ён пачаў ганяцца за медыцынскімі сёстрамі з кіем.

Дзве жанчыны пацярпелі ад дзеянняў хулігана, а дзяжурнаму доктару давялося зачыніцца ў ардынатарскай на ключ. "Завітаў" п'яны і ў палату, дзе разбіў некалькі тумбачак.

